WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9 КАСТРЫЧНІКА 2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 191
(26549)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр Лукашэнка плануе прыняць удзел у саміце СНД у Кішынёве

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка плануе прыняць удзел у пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД, якое пройдзе ў Кішынёве 9 кастрычніка.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Беларускую чыгунку неабходна вывесці на сусветны ўзровень

Такую задачу паставіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў час справаздачы начальніка БЧ Анатоля Сівака.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што БЧ з'яўляецца важнай часткай міжнароднай сістэмы транспартных перавозак. Гэта перш за ўсё скрыжаванне транзітных шляхоў з усходу на захад і з поўначы на поўдзень, таму так важны высокі ўзровень БЧ. «Калі раней мы больш гаварылі аб каляі, забываючыся аб тым, што вакол яе, то сёння трэба весці размову таксама аб лагістыцы», — сказаў Прэзідэнт. Зладжаная і эфектыўная работа чыгункі — не толькі неабходная ўмова дынамічнага развіцця эканомікі, але і фактар станоўчага іміджу, аўтарытэту нашай краіны ў сусветнай супольнасці, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Чыгунка з'яўляецца і нейкім крытэрыем работы ўсёй эканомікі краіны. Так, калі з пачатку года ўпалі грузаперавозкі, то ўжо з красавіка назіраецца іх рост. «Гэта важна, — адзначыў кіраўнік дзяржавы, — гэта сведчыць аб тым, што эканоміка пачынае разварушвацца». Прэзідэнт закрануў таксама пытанне прыходу прыватнага бізнэсу на чыгунку. На яго думку, падыход тут павінен быць адзін: «прыватнік павінен не дзяліць тое, што ўжо ёсць на БЧ, аднімаючы грузаабарот, пасажыраабарот і іншае, а павінен прыбавіць». Кіраўнік дзяржавы выказаў пажаданне пачуць, як ідуць справы на вытворчасцях уласнага рухомага саставу, перш за ўсё вагонаў.

На разгляд Прэзідэнту былі пададзены два новыя праекты. Першы — арганізацыя руху ў Мінску ўнутрыгарадскіх электрычак, якія павінны разгрузіць вулічна-дарожную сетку і палепшыць экалогію горада. Меркаваны інтэрвал руху гарадскіх электрычак — 10 хвілін. Першыя маршруты могуць адкрыцца ўжо ў канцы наступнага года. Другім важным праектам Беларускай чыгункі Анатоль Сівак назваў наладжванне міжабласных чыгуначных зносінаў, якія будуць адпавядаць самым сучасным патрабаванням. У ліку першых плануюць мадэрнізаваць і зрабіць хуткаснымі чыгуначныя зносіны з Брэстам і Гомелем. Паводле слоў Анатоля Сівака, якасць пасажырскіх перавозак рэзка палепшыцца, і жыхары абласных цэнтраў змогуць на цягніку за тры гадзіны даехаць да Мінска.

Прэзідэнт паведаміў, што з наступнага тыдня справаздачы раней назначаных кіруючых работнікаў стануць рэгулярнымі. Ад Анатоля Сівака кіраўнік дзяржавы чакае пачуць яго бачанне перспектывы развіцця чыгункі, прапановы па інтэнсіфікацыі яе дзейнасці.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

ДА ПАЧАТКУ ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў НАШАЙ КРАІНЕ ЗАСТАЛОСЯ 5 ДЗЁН

Завершана навучанне перапісчыкаў. З 9 па 12 кастрычніка яны наведаюць Вас для ўзгаднення зручных для Вашай сям'і даты і часу правядзення апытання ў перыяд з 14 па 24 кастрычніка.

Усе пытанні, што ўзнікаюць па яго правядзенні, можна ўдакладніць па наступных тэлефонах:

8 801 100 30 30 (званкі для насельніцтва бясплатныя), а таксама ў гарадах:

г. Брэст	8 0162 20 53 90, 8 0162 20 31 88
г. Віцебск	8 0212 37 64 37
г. Гомель	8 0232 74 57 25
г. Гродна	8 0152 41 76 74
г. Мінск	8 017 294 55 45, 8 017 290 93 73
г. Магілёў	8 0222 22 49 19

АСАБІСТЫЯ ЗВЕСТКІ ЗАСТАНУЦЦА ТАЙНАЙ

Да пачатку перапісу насельніцтва засталося лічаныя дні. Варта нагадаць, што непасрэдна збор звестак будзе праходзіць з 14 па 24 кастрычніка. А ўжо сёння перапісчыкі распачнуць папярэдні абход — з мэтай пацікавіцца найбольш зручным часам для «асноўнага» візіту. Між тым, не сакрэт: чым бліжэй дата перапісу — тым больш узнікае пытанняў. І адказам на іх была прысвечана сустрэча з журналістамі намесніка старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Беларусі Святланы Навасёлавай.

Навошта гэта трэба?

Без перабольшання, гэта пытанне — адно з найбольш папулярных. Святлана Навасёлава зазначыла: нягледзячы на існаванне шматлікіх базаў звестак аб асобных катэгорыях грамадзян (скажам, аб індывідуальных прадпрымальніках, падаткаплацельшчыках, пенсіянерах і г. д.), поўны малюнак аб насельніцтве можа даць выключна перапіс. Прычым толькі на падставе інфармацыі перапісу магчыма рабіць сацыяльна-эканамічныя прагнозы на ўзроўні дзяржавы і асобных рэгіёнаў, а таксама — вызначаць дэмаграфічныя праграмы.

— У прыватнасці, перапіс дазволіць ацаніць стан нашых сем'яў, — заўважыла намеснік старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта. — У выніку, напрыклад, з'явіцца магчымасць ацаніць, як будзе адбівацца на ўзроўні нараджальнасці той жа рост колькасці грамадзянскіх шлюбаў.

Як збіраюць звесткі?

Перапіс-2009 будзе рабіцца метадам апытання. Такім чынам, яго канчатковыя вынікі будуць залежаць непасрэдна ад адказаў рэспандэнтаў. Прычым патрабаваць якія-небудзь дакументальныя пацвярджанні вусных звестак забараняецца. Разам з тым трэба мець на ўвазе, што перапіс — гэта не сацыялагічнае апытанне.

— На жаль, сёння ёсць спробы звязаць перапіс з палітыкай, маўляў, у выніку будзе створана нейкая база звестак па кожным грамадзяніне Беларусі, — распавяла Святлана Навасёлава. — Таму я мушу адназначна заявіць: гэта — поўная лухта. У перапісным лісце няма ніводнага пытання, якое датычыцца палітычных поглядаў чалавека ці на падставе якога можна нейкім чынам ацаніць настроі ў нашым грамадстве.

СТАР. 4



Любоў Любы Любінскай

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

12 гадоў працуе на ФАПе ў вёсцы Дрысвяты Браслаўскага раёна ***Любоў ЛЮБІНСКАЯ.*** *На яе ўчастку 350 жыхароў, з якіх 92 пенсіянеры. Штодня на сваім веласіпедзе з наборам медыкаментаў Любоў аб'язджае 7 населеных пунктаў.*

— Калі любіш сваю прафесію і шчыра дапамагаеш аднавяскоўцам, яны ставяцца з вялікай павагай, — кажа Л. Любінская.

Родам гэты медык з вёскі Аздамічы Столінскага раёна, закончыла Полацкае медыцынскае вучылішча і па размеркаванні патрапіла ў край Браслаўскіх азёраў. Любоў прызнаецца, што і зямлю гэтую, і яе людзей нельга не любіць.

белагропромбанк

традиции будущего

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

СООБЩАЕТ, ЧТО 15 ОКТЯБРЯ 2009 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ

220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

Повестка дня

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Белагропромбанк» на сумму 50,0 млрд. рублей.
2. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 8 октября 2009 года.

Акционеры банка могут знакомиться с материалами по вопросам повестки дня по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк»: г. Минск, проспект Жукова, 3.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров.

Бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 13 октября 2009 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 23 октября 2009 года.

Телефоны для справок: 8(017) 250 60 01, 250 36 53.

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136

время работы 8.00-22.00 без выходных и праздничных дней;
звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ;
звонок с мобильного телефона (life:), Velcom, MTC) -
по тарифам операторов мобильной связи.
www.belapb.by

ОАО «Белагропромбанк». Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 22.07.2009 г. № 2 УНП 100693551.

АУКЦИОН

**ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «ЭКРАН»
КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»**

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже комплекса зданий, сооружений, и оборудования расположенных по адресу: г. Борисов, ул. Полка Нормандия-Неман, 167, в составе:

1) Насосная станция оборотного водоснабжения – сооружение 31, об. пл. 399 кв.м; **2)** Корпус 12 – гараж, об. пл. 2336 кв.м; **3)** Хлораторная, об.пл. 62,2 кв.м; **4)** Эстакада для мойки машин ж/б; **5)** Устройство ограждения промплощадок (протяж. 402 м); **6)** Автодороги внутриплощадочные; **7)** Тепловые сети; **8)** Сети водопровода; **9)** Канализационные сети; **10)** Ливневая канализация предприятия; **11)** Внешнее электроснабжение; **12)** Подстанция КТП-1388; **13)** Конденсаторная установка (2 ед.); **14)** Кран-балка ЭП-2 (3 ед.). *Начальная цена с НДС (снижена на 40 %) – 579 169 903 белорусских рубля.* Аукцион проводится с условием приобретения победителем аукциона зеленых насаждений (29 деревьев) по рыночной стоимости. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.05.2009 г. Аукцион состоится **16.10.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.10.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.**

Падпіска-2009

З ЛЁГКАЙ РУКІ — У НАДЗЕЙНЫЯ РУКІ

Учора ў сценах рэдакцыі прайшоў традыцыйны штоквартальны розыгрыш прызоў сярод падпісчыкаў, якія засталіся з газетай «Звязда» ў 4-м квартале 2009 года і даслалі запоўненыя купоны.

Адразу скажам, што прызы знайшлі сваіх гаспадароў у самых розных кутках Беларусі. А галоўнымі дзейнымі асобамі ў цяперашняй рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду», як заўсёды, былі нашы госці. На гэты раз — начальнік вытворчасці «Мінская пошта» ШАБЕКА Жанна Васільеўна, дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі АСТРОЎСКІ Іван Іванавіч і старшы навуковы супрацоўнік Інстытута мовы і літаратуры ШАМЯКІНА Алеся Іванаўна (на фота злева направа). Падрабязнасці розыгрышу — у наступным нумары газеты.

Кар. «Звязды».

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Грошы

Фелікс ЧАРНЯЎСКІ:

«ЧУТКІ АБ «СМЕРЦІ» ДОЛАРА МОЦНА ПЕРАБОЛЬШАНЫЯ»

Тое, што адбываецца ў апошнія дні з доларам, чамусьці ўспрымаецца як нешта звышнатуральнае. Цяперашняе падзенне курса амерыканскай валюты хтосьці схільны разглядаць нават як яе крах, прадвесце заняпаду Амерыкі. Сапраўды, колькі ўжо дзён запар іншыя валюты ўмацоўваюцца да «амерыканца». Аднак наўрад ці гэта ў такой жа ступені хвалюе самых амерыканцаў, канкурэнтаздольнасць чыіх тавараў павышаецца.

А вось за межамі ЗША тым часам актыўна абмяркоўваецца верагоднасць таго, што непахісныя да гэтага пазіцыі сусветнай рэзервовай валюты ў хуткім часе могуць быць страчаныя. Алею ў агонь падліла так званая «змова» адвязаць нафту ад долара: агучаная інфармацыя наконт падобнай ініцыятывы на працягу гэтага тыдня «гоніць» курс «бакса» на сусветных рынках уніз. У тым ліку і ў нашай краіне, дзе афіцыйны курс амерыканскай валюты пасля ўчарашніх таргоў зноў «зляцеў» — ужо да 2741 з ранейшых 2749. Аднак, раяць эксперты нашай газеты трымальнікам зберажэнняў у доларах, галоўнае ў такой сітуацыі — не панікаваць. Таму што такога, каб курс гэтай валюты значна абрынуўся ўніз літаральна ўжо заўтра, не будзе.

СТАР. 2

ДЗІЎНАЕ ПАЛЯВАННЕ БАРАЦЬБІТОЎ З КАРУПЦЫЯЙ

Вывадак сіямскіх кацянятак сустракае рэдкіх наведвальнікаў займішча Глушыцы. Яны кідаюцца на кавалкі белага хлеба так, быццам ніколі не бачылі ежы за сваё кароткае жыццё. Брама адчыненая — заходзь хто хоча, бяры што хочаш... Браць, трэба сказаць, тут ужо няма чаго. На ўсіх пабудовах бачныя сляды знявечання. Вырвана і адломлена ўсё, што можна было вырваць і адламаць. Вось калодзеж, на якім яшчэ нядаўна быў электрапрывад для падачы вады ў дамы. Правады абрэзаныя і тырчаць ва ўсе бакі. Насустрач выходзіць мясцовы жыхар Васіль Шыкалаў, вялікі аматар крыжаванак. Нягледзячы на непераадольную цягу да выпіўкі, ён захаваў учэпістую памяць. Я пераконваюся ў гэтым, калі пытаю, ці многа тут было рознай бытавой тэхнікі. Ён мяне здзіўляе прапановай на паперы скласці падрабязны спіс усяго, што тут было, і пачынае пералік...

Фота з сямейнага альбома.

Паляўнічыя з трафеямі.

НЯМА ТАГО, ШТО РАНЬШ БЫЛО...

Прафесійны заатэхнік, якому толькі і засталося, як клапаціцца пра шэсць катоў, з сумам узгадвае сваіх былых гадаванцаў і праводзіць экскурсію па рэштках вялізнай сядзібы. Заходзім у дом.

— Тут на сцяне рысь вісела, галавою ўніз, — паказвае Васіль Львовіч цвікі, якія дагэтуль забітыя па контуры шкуры. Самой шкуры няма. Яна — рэчавы доказ у «паляўнічай справе». — Галава была ў яе, як у чучала. Тут багата чаго на сценах было: розныя паляўнічыя трафеі віселі. Фотаздымкі. Усе былі аматары фатаграфавацца — і з дзікамі, і з самамі — канфіскавалі гэтыя фотаздымкі, са сцен паздымалі. Чучала ваўка было, дзік быў на колцах — яго можна было перакочваць з месца на месца. Многа тут было халадзільнікаў, маразільнікаў, два DVD, «талерка» спадарожнікавая, кухонныя камбайны... А сёння, бачыце, лямпачка на провадзе засталася, а асвятленне з красавіка адключана. У кожнага быў свой вагончык-бытоўка, у ёй — усё неабходнае для жыцця. Тут было 13 вальераў для сабак, кожны — пад сваім нумарам, і ў кожнага ў вальеры свая будачка была. Я заўсёды ведаў, якога чым карміць, якому больш вітамінаў трэба даць. 33 сабакі: 4 ахоўныя аўчаркі і астатнія — элітныя лайкі. Яны ж у нас заўсёды першыя месцы бралі на выставах. Спачатку я ў чыгунах ежу варыў для сабак, а потым тут, на тэрыторыі, пабудавалі сапраўдны кармацэх. Бачыце — халадзільнік прамысловы. Аднекуль усё панавозілі... Для ўсіх жывёлін мне Рыбнікаў і Татарынаў прывозілі муку, корм. Тут і млын быў электрычны.

Васіль Львовіч расказвае, што ён разам з маці гаспадара хутара вучыўся ў адным класе і даўно яго ведаў. Пытаю: «Хто ж тут быў сапраўдны гаспадар? Быццам бы ён глядзіць на мяне з непаразуменнем.

— Падпалкоўнік, натуральна.

— Ён вам плаціў за працу?

— Не. Ён мяне апранаў і карміў. Мы з адной вёскі, з бацькам яго разам працавалі. Бацька аграномам, я — заатэхнікам. Вось тут у нас клеткі з трусамі стаялі. Тут быў куратнік зроблены. Коні былі: Буцафал, Эўрыка, Машка...

Ён узгадвае кожнага з коней не толькі па масці, але і па нораве, і па тым, якога як выкарыстоўвалі, які на што хварэў, памятае... Аб верхавых — з асаблівай любоўю гаворыць. Пра п'янкі-гулянкі ўспамінае неахвотна, быццам баіцца чагосьці, аднак часам у яго вырываецца:

— Падпалкоўнік, калі закончыў акадэмію, сюды прыязджаў са сваімі аднакурснікамі, адзначаў... Пагулялі.

— А жанчыны тут часта бывалі?

— На паляванне з жонкамі не ездзяць, — адказвае Васіль Шыкалаў. — Было такое, што мянялі жанчын. Калі пабыла ўжо, трэба ж мяняць на наступную. У падпалкоўніка свая была — з органаў.

Васіль Львовіч называе званне і імя. Што датычыцца сабак, то іх «састаў» тут пастаянна абнаўляўся. Як сведчаць заўзятыя паляўнічыя, якім не раз даводзілася хадзіць на дзіка, даволі часта здараецца так, што за адно паляванне на іклах секача гіне па тры-чатыры сабакі.

ДРАПЕЖНІЦА З ЧЫРВОНАЙ КНІГІ І ІНШЫЯ ЖЫВЁЛІНЫ

«Паляўнічая справа», пра якую чулі бадай усе, але мала хто што ведае дакладна, заведзена па дзеяннях, якія адбываліся ў тым ліку і на гэтым хутары. Назва Глушыца поўнасцю адпавядае месцазнаходжанню. Без правадніка тут могуць арыентавацца толькі мясцовыя жыхары. Яны, між іншым, апошнія гады імкнуліся абыходзіць сядзібу бокам. Сын былога гаспадара хутара, які ў свой час прадаваў бацькоўскую спадчыну, патомны ляснік Мікалай Канода, расказвае, што з абходам часцяком ля хутара бывае, а вось калі на сядзібе гулялі — падпалкоўнік не дазваляў, каб туды заходзілі нават вады напіцца.

— А дзе людзям вады яшчэ шукаць? Вакол жа жылля больш няма. Бацьку майго выгнаў падпалкоўнік — у сад не пусціў, матку таксама. Нават не дазваляў уздоўж сядзібы іхняй ездзіць. Я яму кажу: тут дарога законная, абгарадзіся, людзі не будуць бачыць, хто там у цябе знаходзіцца. Відаць, баяўся, што ўбачаць. Ён адзін дзень нармальны, а на другі паказвае, што ён — падпалкоўнік. Памятаю, яны сваіх дзевак прывезлі, а тут Бобрыкаў прыехаў са сваёй кампаніяй. Той яму кажа: «Каго ты сюды возіш? Больш не прыязджай сюды». Бобрыкаў з 2006 года і не ездзіў.

А вось калі астанія ездзілі на паляванне, лясная дарога расчышчалася грэйдарам: каб сюды зручна было ў любое надвор'е дабірацца. Сядзіба куплялася ў лістападзе 2003 года. Невялікі калектыў паляўнічых дамовіўся набыць дом, каб было дзе прыпыніцца і адпачыць. Іх, афіцыйных саўладальнікаў, шэсць. Тады яны былі не толькі заўзятымі аматарамі хобі для сапраўдных мужчын, але і сябрамі. Многія ведалі адзін аднаго з дзяцінства. Практычна ўсе звязаныя паміж сабой калі не сваяцкімі, дык суседскімі ці кумаўскімі сувязямі. Вось і падпалкоўнік з прадпрымальнікам Бобрыкавым — таксама кумы.

Васіль Шыкалаў: «Нічога ад кармацэха для жывёлы не засталося».

СТАР. 2

МАЗ-205 — 175 ПАСАЖЫРАЎ!

Новую мадэль аўтобуса другога пакалення — МАЗ-205 — Мінскі аўтамабільны завод упершыню прадэманструе шырокай публіцы на міжнароднай спецыялізаванай выставе пасажырскага транспарту Busworld Europe-2009, якая пройдзе з 16 па 21 кастрычніка ў Бельгіі.

Фота БЕЛТА.

Гэта счленены аўтобус з нізкай падлогай асабліва высокага класа, прызначаны для перавозкі пасажыраў на загружаных гарадскіх маршрутах. Сярод пасажырскіх МАЗаў ён самы доўгі — 18 м 75 см, у шырыню — 2 м 55 см. У гадзіны пік аўтобус зможа перавезці 175 пасажыраў.

МАЗ-205 аснашчаны высокаэкалагічным рухавіком Mercedes стандарта Еўра-5, што дазваляе прапаноўваць новы аўтобус спажыўцам краін Еўрасаюза. Для забеспячэння аптымальнага мікраклімату ў аўтобусе ёсць форткі ссоўнага тыпу, усталяваны кандыцыянер. Цяпло ў халодны час года забяспечвае канвектар і салонныя ацяпляльнікі. Аўтобус цалкам абсталяваны ўсім неабходным для праезду людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. З улікам вялікай даўжыні аўтобуса, для забеспячэння бяспекі пры манеўраванні, адчыненні і зачыненні дзвярэй, МАЗ-205 абсталяваны відэакамерамі, інфармацыя з якіх паступае на экран, што знаходзіцца на працоўным месцы кіроўцы.

Андрэй ПЯТРОЎ, «Мінск—Навіны».

Ёсць нагода

СВЯТА НА ПАТЭЛЬНІ

Што ў вас звычайна на сняданак — кава, бутэрброд, сок, салата? А можа, варта згатаваць яечню ці амлет? Ва ўсякім выпадку, сёння — калі ў многіх краінах свету адзначаецца Сусветны дзень яйка (World Egg Day).

Зацвердзіла свята ў 1996 годзе на канферэнцыі ў Вене Міжнародная яечная камісія — як высвятляецца, ёсць і такая, — абраўшы для гэтага другую пятніцу кастрычніка. Камісія абвясціла, што для ўшанавання яек ёсць не менш за тузін важкіх прычын, а разнастайныя вытворцы яечнай прадукцыі з радасцю падхапілі ідэю. І хоць за апошнія дзесяцігоддзі ў адрас яйка было сказана нямала дрэнна, сучасныя навукоўцы схіляюцца да думкі, што ад прадукту гэтага, поўнага асноўных вітамінаў і мінералаў, а таксама антыаксідантаў, значна больш карысці, чым верагоднай шкоды. Насуперак распаўсюджанаму меркаванню, яйкі не выклікаюць істотнага павышэння ўзроўню халестэрыну — таму варта іх ужываць, але не злоўжываць.

Сусветным лідарам у спажыванні яек лічыцца Японія, кожны жыхар якой у сярэднім з'ядае па адным яйку ў дзень. Таксама асаблівую пашану прадукту выказваюць амерыканцы, якія штогод ладзяць Дні гіганцкага амлету. Сёлета пакаштуюць яго 7 лістапада ў штаце Луізіана, дзе кулінары традыцыйна прыгатуюць амлет Сяброўства з 5 тысяч яек, 6 літраў алею, 25 літраў малака і 10 кг зяленіва.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.10.2009 г. (для б/н разлікаў)

▼ 1 долар ЗША	2 741,00
▲ 1 еўра	4 049,83
1 латвійскі лат	5 713,39
1 літоўскі літ	1 173,22
1 чэшская крона	157,38
1 польскі злоты	960,32
▲ 1 расійскі рубель	92,48
1 украінская грыўня	326,70

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	29,6396
UAH	35,3273
1000 BYR	10,7780
EUR	43,7510

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ДЗІЎНАЕ ПАЛЯВАННЕ БАРАЦЬБІТОЎ З КАРУПЦЫЯЙ

Леанід БОБРЫКАЎ: «Дом, лазня, два хлявы — гэта ўсё, што тут было ў 2003-м».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Тады кожны з шасці скінуўся па пэўнай суме грошай на «дамок паляўнічага». Праўда, аформілі купленую маёмасць не на ўсіх, а на аднаго — Леаніда Бобрыкава:

— Падпалкоўнік мне сказаў: «Так будзе лягчэй аформіць здзелку. У цябе больш вольнага часу, таму павесім дом на цябе. Ды і навошта мне свае пагоны кампраментаваць», — успамінае прадпрымальнік.

У кампаніі заўзятых паляўнічых быў і свой егер — Мікалай Дзядкоўскі. Так што з афармленнем дакументаў на паляванне праблем не было:

— Апошні час я з падпалкоўнікам сварыўся. Проста я павінен быў абавязкова прысутнічаць на паляванні — як егер. Усё пад яго загадам было: коні, дзічкі, куры, качкі, сабакі... Амаль усе сабакі былі яго асабістыя, толькі некалькі — Татарынава і Рыбнікава. Ён усім хлопцам заданні даваў: Лэбан з Рыбнікам (Татарынаў і Рыбнікаў) корм жывёле прывозілі, «Алоўкі» (гэта браты Сіткевічы) будавалі... Акрамя падпалкоўніка, ніхто не меў там права голасу. Як ён скажа, так і робяць. Насамрэч там ніхто не адчуваў сябе сяўладальнікам сядзібы. Калі я задаваў нейкія пытанні наконт дома, ён мне адказваў: «Коля, не лезь не ў свае справы».

Сёння Мікалай Дзядкоўскі панёс пакаранне за тое, што пры ім была застрэлена рысь. Ён, егер, павінен быў не дапусціць забойства звера, занесенага ў Чырвоную кнігу. Забіў лясную драпежніцу Валерый Татарынаў. Былы міліцыянер і паляўнічы са стажам, ён не настроены на гаворку аб тым, што і як было. Мне адказвае толькі на адно пытанне — ці захаваўся калектыў паляўнічых такім, якім быў у 2003 годзе.

— Не, не захаваўся. Бобрыкаў не ездзіў з намі на паляванне. Я не ведаю, чаму. Ён увогуле туды не з'яўляўся. Тры гады — гэта дакладна — яго там з намі не было.

«АЛОЎКІ»: БЕЗ ЗУБОЎ І БЕЗ ГРОШАЙ...

Больш адкрытыя для размоў браты Сіткевічы. Іх тут усе ведаюць пад мянушкай «Алоўкі». 47-гадовыя браты падобныя адзін на аднаго, сапраўды, як алоўкі ў пачку. Рукі ў іх залатыя — хоць намаляваць, хоць пабудаваць, хоць разьбу па дрэве зрабіць. Вярнуліся яны ў 2007 годзе з заробкаў, а тут насустрач — аднакласнік. Далей браты Іван і Валодзя расказваюць самі, перабіваючы адзін аднаго.

— Гаворыць: хлопцы, давайце я вас завязу да добрых людзей, работу атрымаеце, грошай зароміце. Мы селі і паехалі. Два з паловай гады мы прасядзелі ў Глушыцы. Дом на хутары стаяў не абшыты вагонкай, нічога ў доме тады не было, толькі шкуры. Хлеў быў. І свіння дзікая ў хляве. Лазня стаяла, калодзеж. І ўсё.

— Тэрыторыя тады была толькі побач з возерам агароджаная, і тое не паўсюль. Агароджы амаль што не было, толькі брама стаяла. У першую чаргу мы пабудавалі загон для коней — той, што ў лесе. Потым рабілі вальер для дзікоў. Усё лета мы яго будавалі, вялікі вальер атрымаўся. За гэты вальер нам перад Новым годам падарыў падпалкоўнік скутар. Нам сказаў, што ён каштуе 1800 долараў. Цяпер я гэтаму не веру.

— А потым мы будавалі альтанку. Там памеры вялізныя: прыкладна 6 на 10 метраў. У ёй мы стол зрабілі — прыгожы і вялізны. Харчавання было — мора, і гарэлкі — мора. У лазні памываюцца з дзяўчатамі сваімі — і за стол. Двух генералаў з Гомеля прывозілі. Дырэктар БМЗ быў разы два ці тры. Ён нам гарэлку наліваў, запрашаў, каб мы прыехалі да яго зрабіць альтанку, але ж падпалкоўнік нас не адпусціў.

— А потым пачалі будаваць новы кармацэх. Усё з нуля пачыналі — з падмурка. Куратнік новы пабудавалі — прыгожы такі. І адначасова мы рабілі розныя вырабы з трафееяў, якія потым на сцяну вешалі. У асноўным з паляванняў прывозілі дзікоў, коз, лася. Навучылі нас дзічыну разбіраць, што мы і рабілі. Мы ж той дом, што быў, аздобілі вагонкай і знутры, і звонку. За возерам быў агарод, мы там цяпліцу зрабілі, пасадзілі гародніну. Мы яшчэ зрабілі стаянку вялікую — навес для машын, крыты шыферам.

— Падпалкоўнік усе будаўнічыя матэрыялы заказваў, а прывозіў Рыбнікаў. Усім там камандаваў толькі падпалкоўнік, усё толькі ад яго залежала, і ўсе слухаліся толькі яго.

— Падпалкоўнік асабіста нам паказаў, дзе будзе ўчастак пад загон для кабаноў, і мы будавалі.

— Відаць, грошай многа зарабілі?

— Грошай нам не плацілі ўвогуле. Толькі прывозілі прадукты харчавання і цыгарэты. А абяцалі шмат чаго. Падпалкоўнік нам сказаў, што завёў на нас кніжкі і грошы кладзе на кніжку, а мы толькі праз два гады зможам іх узяць. І мы гэтаму верылі. Потым ён у мяне пытаецца: Ваня, як тваё прозвішча? І тут я зразумеў, што ніякай кніжкі ў мяне няма, бо нельга ж адкрыць рахунак, калі не ведаеш прозвішча. Мы пачалі сумнявацца, але ж усё-такі верылі і спадзяваліся на нешта. І ў цесця яго мы пабудавалі альтанку. Дык яго цешча пры нас давала нам грошы за працу — 500 тысяч, а падпалкоўнік нам іх не аддаў. А прывёз нам толькі трусы і майкі. Сказаў, што грошы Валодзю пойдуць на зубы.

Зубы — асобны боль Уладзіміра Сіткевіча. Яму сёння можна толькі паспачуваць, бо дастаткова малады мужчына практычна пазбаўлены магчымасці нармальна есці і размаўляць.

— Я свае зубы павырываў, а падпалкоўнік паабяцаў, што ён іх мне ўставіць. Крутыя зубы абяцаў, сказаў, за 5 мільёнаў. Раней хоць дрэнныя, а былі свае, жаваць можна было. А зараз падпалкоўніка пасадзілі, мы засталіся без зубоў і без грошай.

— Ці часта падпалкоўнік на хутар прыязджаў?

— Вельмі часта — кожныя выхадныя ён там быў. Жонка яго толькі два разы прыязджала. А вось тая, што з міліцыі, прыязджала з ім заўсёды.

— Так, яна тут вельмі часта была. Дзяўчат вазілі многа, я не ведаю, адкуль — маладых дзевак, 18-19 гадоў. Быў там адзін — той любіў маладых дзяўчат, яму іх прывозілі.

— Гарэлку такую наварочаную прывозілі, каньяк, віно добрае. Усё падпалкоўнік прывозіў і іншыя — скрынямі. Старшыня калгаса прыязджаў на белым джыпе, прывозіў па 2-3 скрыні гарэлкі, сумкамі харчаванне. На стол не памяшчалася. Падлогу засцілалі гэтым усім. Там ежа была такая — я такой не бачыў ніколі. Ясі і не ведаеш, што ты такое ясі.

— Іх столькі панаязджае, за стол часам не памяшчаліся. Раз-два ў месяц вялізныя кампаніі бывалі.

«ГАЛІВУДЗІЛІ ДОБРА...»

— Галівудзілі добра. Любілі сеткі закінуць у возера... Мы саромеліся з імі за сталом сядзець, хоць нас і запрашалі. Падпалкоўнік у асноўным не хацеў фатаграфавацца. А вось калі дзічыну застрэляць, пасяduць ля яе, тады разам фатаграфаваліся.

— Кармы для жывёлы, для сабак яны прывозілі. Панавозяць мяхамі — падпалкоўнік разам з Татарынавым і Рыбнікаў. Гэтае мяса псавалася нават, так яго многа было, не паспявалі есці. Па 3-4 такія вялізныя мяхі. Чырвоную рыбу прывозілі. Яе і самім можна было есці. Добрая такая, вялізная рыба...

— А чаму вы без грошай сядзелі, чаму дадому не паехалі?

— Толькі мы дадому паедзем, два дні — і па нас зноў прыязджаюць. Гаворыць: усё, хлопцы, садзіцеся ў машыну, паехалі на хутар. Там трэба яшчэ нешта зрабіць, што вы тут будзеце сядзець.

— Чаму не патрабавалі заплаціць за працу?

— Ведаеце, ён такая шышка, што яму скажаш? Гэта ж простаму чалавеку можна сказаць у вочы, а гэтаму што скажаш? Падпалкоўнік зруб у Жлобін перавёз і казаў, каб мы аздобілі яго ўнутры. Абяцаў, што за гэта падорыць жончыну машыну. Верылі. Гэта ж не с простым чалавекам размаўляеш, а з падпалкоўнікам міліцыі.

Асабліва складана рабацягам было тады, калі раптам пад іх гаспадаром зямля захісталася. «Браты-алоўкі» Сіткевічы ўзгадваюць такую нядаўнюю гісторыю.

— Прыехаў да нас маёр міліцыі разам з Валерам Татарынавым — далі па аркушы паперы. Кажуць: пішыце заяву. І дыктуе: «Пішыце, што вас супрацоўнікі КДБ збівалі, просім узбудзіць крымінальную справу». Валера нам кажа: «Я напісаў, Рыбнікаў напісаў, і вы так пішыце». Ледзь руку не выломвае — пішыце! Мы і напісалі, а потым адмовіліся ад гэтага. Потым у красавіку раніцай сюды прыйшлі тры мужчыны. Пытаюцца: «Хто гаспадар?»

— Мы кажам: Бобрыкаў. Таму што нам падпалкоўнік казаў, калі што — трэба казаць, што дом Бобрыкава, быццам ён гаспадар і ён кожны тыдзень прывозіць прадукты. І нагадвалі неаднаразова: калі да нас хтосьці прыйдзе, каб не пускалі сюды нікога. У іх была апаска нейкая, відаць, штосьці адчувалі. Тады нам гаворыць: «Скажыце, як выглядае Бобрыкаў?» А мы Бобрыкава ніколі не бачылі. Штосьці гаворым, а не ведаем, што Бобрыкаў стаіць насупраць нас.

— А потым, калі ўсё вывозілі адсюль, прыехала да нас дадому жонка падпалкоўніка разам з Валерам Татарынавым. Увесь дом у нас неаперварнулі. Відаць, думалі, што мы будаўнічы інструмент забралі з сабой. Мае разцы па дрэве, і тыя жонка падпалкоўніка забрала. І будачку.

— Гэта потым мы разумелі: навошта мы хлусілі? Трэба было казаць, як ёсць насамрэч.

Сёння браты Сіткевічы шмат аб чым шкадуюць, але ж дакладна не шкадуюць аб тым, што не бачаць больш таго «райскага» жыцця. Кажуць, у Глушыцу больш — ніколі ні кроку.

ХТО ГАСПАДАР?

Аб асаблівасцях шматлікіх паляванняў вакол хутара Глушыца, відаць, ведаюць больш за іншых прафесіяналы ў гэтай справе, дзве правыя рукі падпалкоўніка — Валерый Татарынаў і Уладзімір Рыбнікаў. Аднак яны не надта шматслоўныя. Апошні толькі, як і Татарынаў, пацвярджае, што фармальны ўладальнік сядзібы — Бобрыкаў — даўно не з'яўляўся на хутары.

— Яны з Бобрыкавым пасварыліся. Бобрыкаў там больш не з'яўляўся. І не мае дачынення ні да адной з гэтых пабудоў.

Між тым, пабудовы ў Глушыцы — адзін з асноўных камянёў, аб якія сёння спатыкаюцца ўсе, хто мае дачыненне да «паляўнічай справы». За набудаванае не змагаюцца — адмаўляюцца. Чаму так?

Дом, лазня, два хлявы. І калодзеж звычайны. Гэта ўсё, што было на момант куплі сядзібы ў 2003 годзе.

Судом Жлобінскага раёна дакладна вызначанана, што дом набываўся ў агульную сумесную маёмасць. Тры гады, як Леанід Бобрыкаў не з'яўляўся на гэтай зямлі. Менавіта за гэты час тут былі ўзведзены незаконныя пабудовы.

Адна з іх — той самы вальер для дзікоў, на якіх нацкоўвалі сабак. Вышыня паркана з тоўстых бярвенняў складала 2 метры 20 сантыметраў. Сёння ўсё разабрана і ляжыць вялізнай драўлянай кучай побач з сядзібай. Цікава, што вальер гэты знаходзіўся на значнай адлегласці ад асноўнай сядзібы. Трэба абысці немалую прыгожую сажалку, прайсці праз вялізны яблыневы сад, дайсці да маладога бярэзніка, што ля самага лесу — там і ўтрымліваліся дзікі. Нават калі прызнаць, што фармальна грамадзянін Бобрыкаў — уладальнік сядзібы, то да той зямлі ён не мог мець увогуле ніякага дачынення. Гэты захоп мог зрабіць любы, нават не ўладальнік дома. Тым не менш, сёння прадпрымальніка прызналі вінаватым і ў захопе той зямлі, і ў будаўніцтве вальераў, і ў зносе гэтых незаконных пабудоў.

— Кожны прыезд мы павінны былі ўзгадняць з падпалкоўнікам: хто едзе, каго можна прывезці, — узгадвае камерсант Бобрыкаў. — Я зразумеў, што мне гэта не трэба, і з лютага 2006 года мая нага туды не ступала. Калі да мяне прыйшлі супрацоўнікі КДБ, я ім начарціў план, што там было пры мне — усё так, як куплялася, згодна з дакументамі БТІ. А вось калі мы прыехалі туды, я афігеў! Там столькі пабудоў новых, якіх пры мне не было. Падпалкоўнік не лічыў патрэбным, каб я ведаў, што там будуецца. З таго часу, як мы пасварыліся, у нас былі толькі фармальныя стасункі. Як калісьці, ужо не запрашалі адзін аднаго на сямейныя ўрачыстасці, нягледзячы на тое, што кумы.

Леанід Бобрыкаў, фармальны ўладальнік сядзібы, сёння не разумее, чаму яму прызначаны ўсе штрафы як па адміністрацыйных, так і па грамадзянскіх справах. Не ён усё гэта набудаваў, не ён тут паляваў, не ён сабак і іншых жывёл утрымліваў, не ён электрычнасць незаконна паліў... Так? Так. Але ж штрафы за ўсё менавіта ён павінен плаціць. Немалыя грошы. На іх можна дом пабудаваць.

— Першы адміністрацыйны пратакол быў за незаконны захоп зямлі, — працягвае аповед Леанід Бобрыкаў. — Мяне караюць жлобінскія землеўпарадчыкі — у красавіку гэтага года. Я ў гэты момант ляжаў у бальніцы з гіпертанічным крызам. Прыбягае да мяне землеўпарадчык з пратаколам, я на ім напісаў, што не згодны. Гэтыя вальеры, якія мне прыпісалі, знаходзяцца за 150 метраў ад участка! Потым Новамаркавіцкі сельскі Савет мяне таксама карае — і таксама за незаконны захоп зямлі. Жлобінскі раённы суд — за незаконныя пабудовы. Рэчыцкі лясгас — за тое, што кабаны, якія ўтрымліваліся на гэтай зямлі, пашкодзілі надглебавае покрыва. І потым — за знос вальераў. Гэта ўсё мне прыпісалі. Потым палічылі, што, калі я будаваў, значыць, і святло падключаў. Адміністрацыйны пратакол пацягнуў за сабой грамадзянскія справы. За святло атрымалася так. Пры мне стаяў у доме лічыльнік. У лютым я падпісваў паперы па электраэнергіі. У сакавіку плацілі ўжо тыя, хто там жыў. А ў красавіку складаецца пратакол аб крадзяжы электраэнергіі мною: датуецца лютым і налічваюцца штрафы на папярэднія тры гады. Пабудовы, між іншым, там з'явіліся ў 2007-2008 гадах, але ж штрафы налічылі так, быццам бы яны тры гады там стаялі. На пасяджэнні Жлобінскага райвыканкама мне яшчэ далі штраф. У цэлым атрымліваецца, што я вінен больш за 200 мільёнаў рублёў.

Згодна з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, адміністрацыйныя пратаколы складаюцца на ўладальніка, калі не выяўлена вінаватая асоба. У гэтым выпадку, здаецца, яна дакладна вызначана. Калі нават меркаваць, што ў Бобрыкава быў ускосны намер — ён не сачыў за сваім домаўладаннем — то яго можна было б прыцягнуць да адказнасці, калі б не было выяўлена, ХТО па-сапраўднаму гаспадарыў на гэтай зямлі. Калі вінаватая асоба вызначаная — а ўсе сведкі расказалі, хто прывозіў матэрыялы, будаваў, падключаў электрычнасць — чаму прыцягваюць да адказнасці ўскосна вінаватую асобу, якая нядбайна ставілася да ўтрымання домаўладання? Але ж пры гэтым не прыцягваюць да адказнасці канкрэтна вінаватых асобаў, вызначаных у працэсе разгляду грамадзянскіх спраў? Чаму сапраўды асоба, названая судом вінаватай, не нясе адказнасці за тое, што набудавана ў Глушыцы?

ЧЫЯ ЗЯМЛЯ?

Ёсць і яшчэ адна акалічнасць у гэтай справе. Чыя ж гэта зямля? З адказам на гэтае пытанне паміж сабой не могуць вызначыцца Новамаркавіцкі сельскі Савет і Рэчыцкі доследны лясгас. Пры продажы-куплі дома ў Глушыцы даведку даваў Новамаркавіцкі сельсавет, які тэарэтычна не меў права даваць дазвол на будаўніцтва гэтага дома, таму што зямлю, на якой ён стаіць, спачатку трэба было вывесці з земляў лясного фонду. Бобрыкаў не мог ведаць аб тым, што купіў незаконна ўзведзенае збудаванне, але ж на ўсялякі выпадак штрафамі яго пакаралі і сельсавет, і лясгас. Зразумелым становіцца яго абурэнне:

— Калі я спытаў у старшыні Новамаркавіцкага сельскага Савета, чаму ж яны не зацікавіліся, ці не самавольна будуюцца ў Глушыцы, яна мне адказала: «Калі б я да іх зайшла, я б сядзела ў іншым месцы». Чаму не прыцягваюць да адказнасці тых асобаў, якія павінны наглядаць за землямі свайго лясного фонду? На працягу трох гадоў на іх тэрыторыі пасвіліся і дзікі, і сабакі, ішоў захоп земляў, што, іх егеры не ведалі аб гэтым?

І ўсё ж Бобрыкаў прызнаны вінаватым. Апошняе рашэнне суда Жлобінскага раёна аб устанаўленні факта мізэрнасці здзелкі аспрэчана пракуратурай Жлобінскага раёна. Заблытаная грамадзянская справа знаходзіцца на паўторным разглядзе ў Гомельскім абласным судзе.

ХТО ЗАПЛАЦІЦЬ ПА РАХУНКУ?

Між тым, зразумела, што ўсё, аб чым ішла гаворка, — толькі вяршыня айсберга. Яго падводная частка куды больш значная. І гэта ўжо іншая крымінальная справа, таксама звязаная з дзеяннямі, аб якіх ішоў аповед. Яе назва «паляўнічая» — вельмі ўмоўная. Пакуль мы не маем магчымасці называць прозвішча галоўнай дзейнай асобы на хутары Глушыца, таго самага падпалкоўніка. Ён знаходзіцца ў следчым ізалятары КДБ, абвінавачваецца па артыкуле «перавышэнне ўлады». Але ж гэта аб яго «подзвігах» узгадаў на нарадзе з аператыўна-начальніцкім саставам 29 чэрвеня 2009 года Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Цытую па сайце http://respublika.info/4784/official/article32178/ у перакладзе на беларускую мову: «Выяўлена маса выпадкаў, калі так званыя барацьбіты са злачыннасцю, выкарыстоўвалі дадзеныя ім правы і магчымасці ў злачынных мэтах. Так, у поле зроку КДБ трапіў начальнік аддзела па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі Жлобінскага РАУС. Вызначана, што ў 2003 годзе ён набыў і аформіў на падстаўную асобу сядзібу плошчай больш за 2 га ў лясным масіве на тэрыторыі Жлобінскага раёна. Ён захапіў больш за 1 га лясных угоддзяў, пабудаваў 400 самавольных пабудоў, абзавёўся зграяй з 29 пародзістых сабак і дзікамі. Усю гэтую гаспадарку бясплатна абслугоўвалі мясцовыя жыхары. Пры гэтым незаконна выкарыстоўваліся электраэнергія, рахунак за якую за апошнія тры гады перавысіў Br 26 млн. На створанай базе рэгулярна палявалі і рыбачылі кіруючыя работнікі, высокапастаўленыя адказныя асобы органаў унутраных спраў».

«Паляўнічая справа», як вялізная рака з ручаёў, складаецца цяпер з некалькіх спраў, не толькі крымінальных, але адміністрацыйных і грамадзянскіх. Частка з іх датычыцца той самай «падстаўной асобы» — прадпрымальніка Леаніда Бобрыкава, які ў гэтым выпадку, здаецца, стаў ахвярай сваёй легкадумнасці пры афармленні пэўных дакументаў на маёмасць яшчэ шэсць гадоў таму. Дзякуючы гэтым абставінам яму і даводзіцца літаральна плаціць па рахунках «за таго хлопца».

З іншага боку, такі расклад адназначна выгадны той самай асобе, якая зараз знаходзіцца пад следствам. Для яе гэта адзначае вызваленне ад адказнасці за здзяйсненне наўмысных супрацьпраўных дзеянняў, прадугледжанай Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, бо за ўсё ўжо панёс пакаранне іншы чалавек.

І апошняе: аб справах, што адбываліся на Глушыцкай сядзібе на працягу некалькіх апошніх гадоў, добра ведалі практычна ўсе жыхары навакольных вёсак, ды і многія ў сямідзесяцітысячным Жлобіне, які знаходзіцца ў 47 кіламетрах ад паляўнічага займішча. Атрымліваецца, што лічылі прымальным: калі ёсць зоркі на пагонах, значыць, ІМ — можна ўсё. Ці сапраўды людзі баяліся, што іх скаргі супраць іх жа і павернуцца?

Здаецца, страты маральныя ў гэтай гісторыі куды большыя за матэрыяльныя...

Вольга АЎРАМЕНКА.

Домік для цесця, які «Алоўкі» не паспелі аздобіць.

Абзац

◢ Мінчане з наступленнем халадоў сталі больш актыўна наведваць лазні. Як падлічылі ва УП «Гарадскія лазні», у верасні лазневыя працэдуры прынялі 61,1 тыс. мінчан (у жніўні было 57 тыс. аматараў пары). Найбольшы лік аматараў папарыцца бывае ў горадзе ў кастрычніку-лістападзе. Усяго сёлета за 9 месяцаў мінскія лазні наведалі 651,9 тыс. чалавек (летась за той жа перыяд — 683,4 тыс.). Між тым шмат месцаў застаюцца свабоднымі — сёлета лазні запоўненыя толькі на 55,8 %. Са жніўня кошт гэтых паслуг павялічыўся: квіток у агульнае аддзяленне — на 4 %, у нумары першага разраду і люкс — на 10 %.

◢ Чатырохгадовы хлопчык загінуў на пажары ў Мастоўскім раёне. Трагедыя адбылася ў вёсцы Тоўсцікі. Бацькі пакінулі хлопчыка аднаго, самі пайшлі на працу. У гэты час узнік пажар, хутчэй за ўсё, з-за дзіцячага свавольства з агнём. За апошнія тры дні ў Гродзенскай вобласці на пажарах загінула 6 чалавек.

◢ Кіраўнік аднаго з цэхаў Смаргонскага агрэгатнага завода скраў на прадпрыемстве і вывез на сваёй машыне 195 дэталяў для міні-трактараў і мотаблокаў. Злодзея вылічылі выпадкова — адзін з супрацоўнікаў Дэпартамента аховы звярнуў увагу на аўтамабіль, што стаяў на абочыне і быў яўна перагружаны. Для праверкі падазронага аўто была накіраваная група затрымання. Ніякіх дакументаў, што пацвярджалі б легальнасць грузу, у 61-гадовага вадзіцеля не было. Пры сустрэчы з міліцыянерамі ён паспрабаваў збегчы. Кошт скрадзеных дэталяў ацэньваецца больш чым у Br11,5 млн.

Поўны абзац

◢ Пакет з 400 тыс. еўра, што праляжаў у бюро знаходак кампаніі Deutsche Bahn тры гады, не знайшоў свайго ўладальніка і стаў уласнасцю чыгуначнай кампаніі. 7 кастрычніка скончыўся афіцыйны тэрмін захоўвання грошай. Пакет прынёс у бюро нямецкі пенсіянер з Вісбадэна, які ў кастрычніку 2006 г. знайшоў яго ў прыбіральні хуткага цягніка Берлін — Франкфурт-на-Майне. Паколькі ніхто за гэты час не прад'явіў сваіх правоў на знаходку, сума перайшла ва ўласнасць чыгуначнай кампаніі. Пенсіянеру, згодна з законамі, належыць 1,5 % ад сумы, або 6 тысяч еўра.

◢ Пажылая брытанка памерла ў выніку няшчаснага выпадку падчас гульні ў гольф. Партнёр па гульні выпадкова трапіў 66-гадовай жанчыне мячыкам у патыліцу. Пасля ўдару жанчына страціла прытомнасць, яе даставілі на верталёце ў адну з бальніц Глазга, аднак урачам не ўдалося выратаваць яе жыццё. У жанчыны было двое дзяцей і двое ўнукаў.

◢ Інспектар ДАІ развозіў малако па крамах Гомеля замест п'янага вадзіцеля, паведамілі БЕЛТА ў ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама. На адной з вуліц абласнога цэнтра супрацоўнікі ДАІ спынілі грузавую машыну, што перавозіла малако. Вадзіцель аўто яўна быў нецвярозы, што пацвердзілі і медыцынскія тэсты. Весці машыну далей ён не мог, таму паўстала пытанне: што рабіць з малаком, якое везлі з Петрыкаўскага раёна ў гандлёвыя кропкі Гомеля? П'янага вадзіцеля пасадзілі на пасажырскае сядзенне (бо толькі ён валодаў накладнымі і памятаў, куды трэба ехаць) і даставілі прадукт куды было трэба. «А што было рабіць? У адваротным выпадку малако пракісла б», — патлумачылі міліцыянеры.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

«ЧУТКІ АБ «СМЕРЦІ» ДОЛАРА МОЦНА ПЕРАБОЛЬШАНЫЯ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Што ж датычыцца чарговага «наступлення» на долар, то, напрыклад, на думку **старшыні Асацыяцыі беларускіх банкаў Фелікса ЧАРНЯЎСКАГА,** гэта — звычайная спекуляцыя.

— Гэта рынак, і на спекуляцыях пэўныя людзі нажываюцца, — тлумачыць ён. — У першую чаргу трэба ацэньваць стан эканомікі Злучаных Штатаў, а толькі потым усё астатняе.

— Наўрад ці абнадзейвальнай будзе інфармацыя пра тое, што, паводле ацэнак экспертаў, дэфіцыт бюджэту ЗША больш як патроіўся і да 30 верасня дасягнуў рэкордная сумы ў 1,4 трыльёна долараў.

— Асноўнай прычынай дэфіцыту стаў сусветны фінансавы крызіс. Злучаныя Штаты «ўлілі» вялікія грошы ў банкаўскі сектар у выглядзе крэдытных рэсурсаў, каб выратаваць фінансавы сектар. Акрамя таго, яны развівалі ваенную праграму, і вельмі моцна раслі ваенныя расходы. Цяпер апошнія абмяжоўваюцца.

— Зразумела, што ЗША будуць прымаць пэўныя захады, каб не згубіць свае пазіцыі ў свеце. Разам з тым, як мяркуеце, ці існуе «змова» супраць долара, хоць асобныя краіны, якіх да ініцыятывы «далучылі» тыя ж СМІ, падобнае абвяргаюць?

— Чаму б і не. Чаму б краінам не спрабаваць гэта зрабіць. Тым больш, што такія захады рабіліся і раней, былі створаны спецыяльныя правы пазыкі Міжнароднага валютнага фонду. Гэта не новая ідэя, і спробы такія, сапраўды, ёсць. Аднак шмат залежыць ад таго, што будзе адбывацца далей у сусветным раскладзе. Трэба сказаць, што эканоміка ЗША пакуль складае каля 25 працэнтаў сусветнай вытворчасці, 40 працэнтаў сусветнага спажывання, у той час як Кітая — 12 працэнтаў, Расіі — 6.

Па-другое, паніжэнне курса долара выгаднае Злучаным Штатам, каб развіваць нацыянальную эканоміку. Імпарт даражэе, і ЗША, напрыклад, перастаюць купляць японскія, заходнееўрапейскія тавары. Такім чынам там пачынаюць купляць свае тавары, падтрымліваць сваю вытворчасць. Я думаю, чуткі аб «смерці» долара моцна перабольшаныя. І, мяркую, калі гэта адбудзецца, то толькі тады, калі іншыя эканомікі ўзмацняцца настолькі, што змогуць канкураваць з амерыканскай. Еўропа аб'ядналася, але еўра ж не стаў сусветнай валютай. І яшчэ невядома, як сітуацыя будзе складвацца надалей. Еўрапейскія тавары пакуль яшчэ вельмі дарагія, а амерыканскія танныя. Аўтамабілі, напрыклад, з Амерыкі праз акіян транспартаваць і купляць танней, чым з Заходняй Еўропы.

— Адным словам, простым людзям, якія назапасілі крыху долараў, хвалявацца не трэба?

— Калі яны хочуць павялічыць даходнасць ад сваіх зберажэнняў, няхай трымаюць іх у беларускіх рублях: працэнтная стаўка па рублёвых дэпазітах значна вышэйшая. Аднак падкрэслю і тое, што хістанні курсу долара, якія адбываюцца, не істотна ўплываюць на даходы і расходы грамадзян: куды больш шкоды ад панікі, ад чутак накшталт тых, што той жа долар «пахаваюць». Калі амерыканскую валюту «скідваюць» і прадаюць, нехта ж яе купляе. Для чаго?

— Вы маеце на ўвазе, каб зарабіць, калі курс пойдзе ўверх?

— Натуральна. Спекулянты нават на маленькіх курсавых змяненнях вялікія сумы зарабляюць, таму што аперыруюць вялікімі аб'ёмамі грашовых сродкаў. Укладчыкам жа хістанні курсаў валют не прынясуць вялікіх страт, а, магчыма, у будучыні прынясуць і прыбытак.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Парламенцкі дзённік

Вайскоўцы па-за палітыкай

На пасяджэнні трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў у першым чытанні разглядаўся праект Закона «Аб статусе вайскоўцаў». Як заўважыў міністр абароны Леанід Мальцаў, асобныя прававыя і сацыяльныя гарантыі, прадугледжаныя статусам вайскоўцаў, мяркуецца распаўсюдзіць на грамадзян, звольненых з ваеннай службы, членаў сем'яў грамадзян, звольненых з ваеннай службы, членаў сем'яў вайскоўцаў, загінулых, памерлых і тых, хто прапаў без звестак альбо стаў інвалідам пры выкананні вайсковай службы, а таксама членаў сем'яў вайскоўцаў, якія памерлі ў выніку наступстваў ваеннай службы пасля звальнення з ваеннай службы.

Законапраектам вызначаныя і пэўныя абмежаванні для вайскоўцаў у агульнаграмадзянскіх правах і свабодах. Так, людзям, што выконваюць вайсковы абавязак, забараняецца ўдзельнічаць у забастоўках, быць членамі палітычных і іншых грамадскіх аб'яднанняў, якія маюць палітычныя мэты (калі чалавек уладкоўваецца на вайсковую службу па кантракце, альбо прызываецца ў войскі, ён павінен прыпыніць сваё членства ў партыях і палітычных арганізацыях). Вайскоўцам забараняецца зарабляць грошы на дадатковай працы, акрамя як выкладчыцкай, навуковай, культурнай і творчай накіраванасці, якая здзяйсняецца па ўзгодненні з камандзірамі вайсковых часцей, у якіх яны праходзяць службу. Пры знаходжанні на тэрміновай службе салдату забараняецца атрымліваць адукацыю ў грамадзянскіх навучальных вышэйшых і сярэднеспецыяльных установах. Законапраект таксама размяжоўвае меры страхавых выплат у залежнасці ад умоў атрымання траўмы ці гібелі вайскоўца. Напрыклад, яны будуць рознымі пры гібелі на вучэнні і пры гібелі па дарозе да месца нясення службы.

Цэны ўпадуць, калі стануць свабоднымі

Дэпутаты ўзнялі перад міністрам гандлю Валенцінам Чэканавым пытанне рэгулявання цэнаў. «Пытанне цэнаўтварэння датычыцца міністэрства эканомікі, але я, як член Урада, не магу абысці яго. Боязь свабодных цэнаў прыводзіць, напрыклад, да таго, што ў рэстаранах Мінска за ежу трэба плаціць больш, чым у еўрапейскіх рэстаранах. Мы баімся адпусціць цэны, а ў выніку гэта, наадварот, прыводзіць да таго, што кошты становяцца высокімі. Лічу, што пры свабодным цэнаўтварэнні спрацуюць механізмы рынкавай эканомікі і пачнецца адваротны працэс, калі цэны пачнуць зніжацца. Зразумела, на сацыяльна значныя тавары, такія, як хлеб, малочныя прадукты і іншыя, цэны павінны рэгулявацца, а што датычыцца іншай прадукцыі, думаю, што тут водпуск цэн непазбежны», — заўважыў міністр гандлю.

Фінансаванне па правілах

Ратыфікавана рамачнае пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і камісіяй Еўрапейскіх супольнасцяў. Адначасова з ім у мэтах выключэння магчымасцяў рознага тлумачэння, выкарыстаных у рамачным пагадненні тэрмінаў і нормаў, беларускі бок дамогся падпісання Пратакола па пытанню аб тлумачэнні паняццяў, тэрмінаў і азначэнняў.

— Ратыфікацыя Рамачнага пагаднення паміж урадам Рэспублікі Беларусь і камісіяй Еўрапейскіх супольнасцяў, безумоўна, патрэбна нашай краіне, бо так мы атрымліваем фінансаванне ад ЕС, якое ідзе на развіццё тых праграм, што абазначаны ў рамачным пагадненні: гэта памежнае супрацоўніцтва, барацьба з гандлем людзьмі, ахова навакольнага асяроддзя, барацьба з наступствамі ў выніку аварый на ЧАЭС, адукацыя і супрацоўніцтва ў Балтыйскім рэгіёне, — заўважае член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД Валянціна Лявоненка.

Прынамсі, Еўрапейскі саюз з'яўляецца найбуйнейшым донарам тэхнічнага садзейнічання Беларусі па ліні праграмы Тасіс, за час дзеяння праграмы наша краіна атрымала значную фінансавую дапамогу: у нас было рэалізавана 320 праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі на суму 200 мільёнаў еўра, альбо больш за 40 працэнтаў ад усёй тэхнічнай дапамогі, якую Беларусь атрымала, пачынаючы з 1991 года. У 2007—2010 гадах Еўракамісіяй прадугледжана выдзяленне Беларусі сродкаў тэхнічнай дапамогі агульным памерам у 20 мільёнаў еўра.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

АДЗІН ДЗЕНЬ ДЛЯ КУЛЬТУ АСОБАЎ

Касірка ў тэатральнай касе таксама стварае культуру. І часам ад яе можа залежаць, ці атрымае чалавек радасць увечары, з якім настроем прыйдзе на наступны дзень на працу. Яна нават можа вырашыць лёс, прадаўшы апошнія два білеты закаханым студэнтам, тым самым вызначыць, ці ўдала пройдзе першае спатканне. Старшая касірка тэатра імя Янкі Купалы Леакадзія Іосіфаўна Сарока, такім чынам, лёсавызначальніца са стажам. Яна прадае квіткі на спектаклі 43 гады! Неаднойчы была сведкай таго, як у яе атрымліваецца не засмуціць чалавека. Міністр культуры Беларусі сам на днях купляў у яе квіткі ў тэатр — прызнаўся ў гэтым, калі ўзнагароджваў жанчыну ганаровай граматай Міністэрства культуры ў сувязі са святам — Днём работнікаў культуры. Леакадзія Іосіфаўна прасіла заходзіць яшчэ...

— Хацеў бы павіншаваць усіх работнікаў культуры з нашым святам, — сказаў Павел Латушка на ўрачыстым зборы ў Вялікім тэатры оперы і балета. — Культура — найважнейшая сфера для кожнай дзяржавы, не выключэнне і Рэспубліка Беларусь. Дзякуй за

Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

9 КАСТРЫЧНІКА 2009 г. ПЯТНІЦА № 38 (15592)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Абітурыент-2010

ПУНКТЫ РЭГІСТРАЦЫІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ПЕРШАГА РАЎНДА РЭПЕТЫЦЫЙНАГА ТЭСЦІРАВАННЯ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

г. Мінск

№ п/п	Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
1	УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт»	г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 4, к. 116, тэл. 209 54 06
2	УА «Інстытут бесперапыннай адукацыі» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта	г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, к. 43, тэл. 222 80 10
3	Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі	г. Мінск, вул. Гікалы, 9, к. 422, тэл.: 293 86 49, 293 80 40
4	Міжнародны дзяржаўны экалагічны ўніверсітэт імя А.Д. Сахарава	г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23, к. 107, тэл. 230 73 72
5	Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт	г. Мінск, пр. Незалежнасці, 65, тэл.: 237 39 25, 292 38 42
6	Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт	г. Мінск, пр. Незалежнасці, 99, тэл.: 267 05 92, 267 72 68
7	Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт On-line рэгістрацыя	г. Мінск, вул. Захарава, 21, к. А, аўд. 214, тэл. 284 81 43
8	Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт	г. Мінск, пр. Партызанскі, 26, к. 1, аўд. 1205, тэл. 209 78 15
9	Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка	г. Мінск, вул. Савецкая, 18, тэл.: 200 94 17, 200 92 04
10	Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт	г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, тэл.: 227 73 89, 227 07 78
11	Мінскі дзяржаўны політэхнічны каледж	г. Мінск, пр. Незалежнасці, 85, тэл.: 292 12 34, 292 81 05
12	Мінскі дзяржаўны аўтамеханічны каледж	г. Мінск, вул. Сацыялістычная, 5, тэл. 243 19 88
13	Мінскі дзяржаўны гандлёвы каледж	г. Мінск, вул. Усходняя, 183/43, тэл.: 262 46 16, 237 58 99

Мінская вобласць

Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
Барысаўскі дзяржаўны політэхнічны каледж	г. Барысаў, вул. Гагарына, 68, тэл.: 8(0177) 74 49 51, 74 48 02, 75 25 78
Маладзечанскі дзяржаўны політэхнічны каледж	г. Маладзечна, вул. Цэнтральная, 2, тэл.: 8(01773) 7 77 32, 7 18 63, 7 10 32
Аддзел адукацыі Любанскага райвыканкама	вул. Першамайская, 24а, тэл. 8(01794) 5 15 44
Аддзел адукацыі Маладзечанскага райвыканкама	вул. Прытыцкага, 5, к. 14, тэл. 8(01733) 7 08 97 пл. Цэнтральная, 2, тэл.: 8(01773) 7 18 63, 7 00 72
Аддзел адукацыі Чэрвеньскага райвыканкама	пл. Свабоды, 1, тэл. 8(01714) 5 59 83
Аддзел адукацыі Капыльскага райвыканкама	вул. Горкага, 36, тэл. 8(01719) 5 45 45
Аддзел адукацыі Мядзельскага райвыканкама	пл. Шаранговіча, 2, тэл.: 8(01797) 5 51 97, 5 55 85
Аддзел адукацыі Дзяржынскага райвыканкама	вул. Ленінская, 21, тэл. 8(01716) 6 54 46
Аддзел адукацыі Клецкага райвыканкама	вул. Маякоўскага, 10, тэл.: 8(01793) 5 32 47, 5 55 61
Аддзел адукацыі Нясвіжскага райвыканкама	вул. Савецкая, 1, тэл. 8(01770) 5 90 17

Брэсцкая вобласць

Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт	вул. Маскоўская, 267, тэл.: 8(0162) 42 70 71, маб. 8(033) 606 66 16

Віцебская вобласць

Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт	пр. Маскоўскі, 72, тэл. 8(0212) 47 72 34
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт	вул. Блахіна, 29, тэл. 8(0214) 53 05 35

Гродзенская вобласць

Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы	вул. Кастрычніцкая, 5, аўд. 102, 106 тэл.: 8(0152) 73 01 01 (шматканальны), 74 14 86

Гомельская вобласць

Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П.В. Сухога	г. Гомель, пр. Кастрычніка, 48, тэл. 8(0232) 47 52 74

Магілёўская вобласць

Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
Беларуска-Расійскі ўніверсітэт	пр. Міру, 43, аўд. 221, тэл. 8(0222) 25 36 03
Бабруйскі філіял Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта	г. Бабруйск, вул. Сацыялістычная, 90, тэл. 8(0225) 52 21 95

Аплата за ўдзел у тэсціраванні па адным вучэбным прадмеце ажыццяўляецца ў любым аддзяленні ААТ «ААБ Беларусбанк» у суме 16 100 беларускіх рублёў. Атрымальнік — УА «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў», разліковы рахунак № 3632934510021 філіял № 529 «Белсувязь» ААТ «ААБ Беларусбанк» г. Мінска, код 720, УНП 190194148.

РІКВ не адказвае за якасць і змест тэстаў для тэсціравання, якое праводзіцца іншымі (не названымі ў гэтым спісе) установамі.

«Дома ўсім раскажам, якія ў Беларусі надзейныя камбайны і трактары, добразычлівыя людзі і багатая бібліятэка»

Маладыя вучоныя з Рэспублікі Казахстан прыехалі ў Беларусь, каб пазнаёміцца з асаблівасцямі развіцця сельскай гаспадаркі

Усё пачалося з таго, што ў Брэсце прайшло чарговае пасяджэнне Міжурадавай беларуска-казахскай камісіі па развіцці супрацоўніцтва. Там абмяркоўвалася, у тым ліку, пытанне магчымай стажыроўкі казахскіх маладых вучоных на базе Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў АПК БДАТУ. Пасяджэнне адбылося напрыканцы чэрвеня. І ўжо ў верасні група з пяці чалавек, накіраваная Інстытутам павышэння кваліфікацыі «Міжнароднай прафесійнай акадэміі» Туран-Профі», завітала ў Мінск.

— Нас вельмі цёпла прынялі, — расказвае **прадстаўнік Алма-ацінскага тэхналагічнага ўніверсітэта Есмурат МАЦЕЕЎ**. — Размясцілі ў добрым інтэрнаце. Там ёсць усё, і галоўнае — побач цудоўны стадыён, што для людзей, якія вядуць здаровы лад жыцця, вельмі важна. Горад чысты, зялёны, вакол добразычлівыя людзі. У каго што ні спытай — заўсёды спыняцца, патлумачаць, падкажуць.

— У Жодзіне, які наведалі ў межах вучэбнай праграмы, спрабавалі злавіць таксі, — дадае **навуковы супрацоўнік Казахскага НДІ бульбаводства і агародніцтва Дзінара ШАРЫПАВА**. — Малады чалавек убачыў, што мы не мясцовыя, спыніўся, выклікаў таксі і толькі пераканаўшыся, што ў нас усё ў парадку, пайшоў па сваіх справах.

— Вельмі ўразіла Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка, — адзначыла **старшы выкладчык Казахскага агратэхнічнага ўніверсітэта імя Сейфуліна Халіма МУРСАЛАВА**. — Там, склалася ўражанне, можна знайсці любую інфармацыю.

Галымжан Абуоў, Баўыржан Жакееў, Есмурат Мацееў, Халіма Мурсалава і Дзінара Шарыпава ўпершыню ў Беларусі і вельмі рады, што атрымалі магчымасць ажно на працягу месяца глядзець, аналізаваць і вучыцца ўсяму самаму лепшаму.

— Мы не столькі займаемся ў класах, колькі выязджаем у розныя гарады і вёскі рэспублікі, дзе знаёмімся з досведам вядучых сельскагаспадарчых арганізацый, прадпрыемстваў, якія вырабляюць сельскагаспадарчую тэхніку, — кажа Есмурат Мацееў. — Адным словам, праграма ў нас насычаная, і паўсюль нас прымаюць як сваіх. Вельмі хочацца трапіць на Гомсельмаш, туды, дзе вырабляюць камбайны «Палессе». Ужо неаднаразова чуў станоўчыя водгукі пра гэту тэхніку, але хочацца пабачыць усё на свае вочы. Ведаеце, якасць вашай тэхнікі не выклікае сумненняў. У нас да гэтага часу на палях можна ўбачыць МТЗ 80-га года выпуску. І ніякія паломкі ім не страшныя. Парамантуюць — і зноў у поле.

Адзначылі госці і тое, што на беларускіх палях пераважае айчынная тэхніка.

— У нас жа ў Казахстане большасць імпартнай, у прыватнасці расійскай, — кажуць яны. — Сваёй мала. А машынабудаванне для перапрацоўкі — дык і наогул няма. У Беларусі сельская гаспадарка развіваецца, аб гэтым сведчыць, у прыватнасці высокая ўраджайнасць. У нас жа правесці

нейкую рэформу вельмі складана, бо практычна ўсе сельскагаспадарчыя ўгоддзі знаходзяцца ва ўласнасці фермераў. Аб такой ураджайнасці нам пакуль даводзіцца толькі марыць.

— Яшчэ марым аб тым, што павязём з сабой дадому 6 гатункаў бульбы для экалагічнага выпрабавання, — адзначае Дзінара Шарыпава. — Зараз маё начальства вядзе перамовы з вашым Інстытутам бульбаводства і агародніцтва. Спадзяюся, што да майго ад'езду яны ўжо заключаць дагавор.

— Ёсць у нас фірмы, якія б з задавальненнем наладзілі супрацоўніцтва з гомельскім прадпрыемствам, што выпускае апараты для даення, — дадаў Есмурат Мацееў.

— Наш прыезд — добры крок да наладжвання больш цеснага супрацоўніцтва паміж дзвюма аграрнымі рэспублікамі, — лічаць маладыя вучоныя. — Вернемся дадому і абавязкова пачнём праводзіць тэматычныя семінары як для студэнтаў, так і для спецыялістаў-практыкаў.

—І, ведаеце, я ў будучыні наведаю вашу краіну яшчэ раз, — падзяліўся сваімі планамі Есмурат Мацееў. — Вельмі хацелася б абараняць кандыдацкую дысертацыю менавіта ў Беларусі. Раней я ніяк не мог зразумець, чаму іншаземцы едуць па адукацыю менавіта сюды. А зараз пры першай магчымасці задаў гэта пытанне студэнтам з Кітая, арабскіх краін, якія вучацца ў БДАТУ і жывуць у адным інтэрнаце з намі. Яны адказалі, што тут можна, не баючыся, выйсці на вуліцу ў любы час сутак. А таксама беларуская адукацыя славіцца спалучэннем якасці з прымальным коштам. Мы на свае вочы пераканаліся ў тым, што на кафедрах БДАТУ ў вялікай колькасці выстаўлена самая сучасная тэхніка.

Падчас нашай размовы з маладымі вучонымі прысутнічаў **рэктар Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў АПК БДАТУ Уладзімір ДАШКОЎ**.

— Уладзімір Мікалаевіч, скажыце, калі ласка, якое значэнне для нашай краіны мае прыезд гасцей з Казахстана?

— Тое, што казахскі бок зацікавіўся беларускай тэхнікай, тэхналогіямі, якія актыўна прымяняюцца ў нашай сельскай гаспадарцы, беларускай бульбай — гэта вельмі добра. Вось прыедзе, напрыклад, Есмурат Мацееў дадому і раскажа, што ёсць у Беларусі тэхніка, якая ніколькі не саступае па якасці, напрыклад, расійскім аналагам. Такім чынам мы можам разлічваць на папулярызацыю нашых дасягненняў з перспектывай на экспарт. У будучыні, я думаю, да нас будуць прыязджаць вучыцца не толькі вучоныя, але і спецыялісты-практыкі з сельскагаспадарчых арганізацый Казахстана. Так, прынамсі, развіваліся стасункі з расіянамі. Летась на стажыроўку да нас прыехала 12 чалавек, сёлета ў два разы больш. Раней практычна кожны казах не па чутках ведаў, што такое Беларусь. Зараз жа адзінкі маладых людзей, прадстаўнікоў новага пакалення, наведвалі нашу краіну. Гэту памылку трэба пакрысе выпраўляць.

Надзея ДРЫЛА.

АНДРЭЮ АРАМНАВУ ЗБІРАЮЦЦА ВЯРНУЦЬ СТЫПЕНДЫЮ

Больш за паўгода рэкардсмен свету па цяжкай атлетыцы мае заробак звычайнага беларускага дворніка

Стыпендыю, а гэта каля 15 мільёнаў беларускіх рублёў, штангісту абрэзалі за правапарушэнне, пра якое ўся Беларусь даведалася ў сакавіку гэтага года. Андрэй нядоўга «замачыў» новую кватэру, якую атрымаў за залаты медаль пекінскай Алімпіяды. Міліцыя спыніла аўтамабіль Арамнава. Штангіст быў нецвярозы. Наступствы сталіся цяжкімі — Арамнаву не толькі прысудзілі штраф у 5 мільёнаў 200 тысяч беларускіх рублёў, але і ператалі выплачваць стыпендыю.

У пачатку ліпеня «Звязда» надрукавала інтэрв'ю з Андрэем Арамнавым, у якім штангіст упершыню шчыра пакаяўся перад беларусамі за свае «дзіцячыя паводзіны». Адзінае, чаго не зразумеў рэкардсмен свету, чаму перасталі выплачваць стыпендыю. Усё ж далі яе за залаты алімпійскі медаль, які ніхто ў Арамнава не канфіскаваў.

І вось нарэшце застаўся адзін крок да аднаўлення справядлівасці — стыпендыю збіраюцца вярнуць.

— Па-праўдзе, у мяне цалкам скончыліся грошы на жыццё, няма ніякага настрою, — распавядае Андрэй Арамнаў «Звяздзе». — Я ледзьве не напісаў заяву пра звальненне з нацыянальнай каманды. Без заробку мне цяжка нармальна трэніравацца. Усё ж я пераасэнсаваў свае паводзіны, мне было вельмі соромна, пакаранне я атрымаў сур'ёзнае. Але, нягледзячы на гэта, зарплата мне прыходзіла такая: то 226 тысяч, то каля 400 тысяч. Зарабляў, як звычайны дворнік. Нарэшце мне паабяцалі вярнуць стыпендыю. Кажуць, што пачнуць яе выплачваць з наступнага месяца — лістапада.

У суботу Андрэй Арамнаў выступіць на чэмпіянаце Беларусі па цяжкай атлетыцы. Спаборніцтвы пачнуцца а 11-й гадзіне ў сталічным спарткомплексе «Спартак». Галоўны трэнер зборнай Беларусі Аляксандр Ганчароў таксама пацвярджае, што Арамнаў асэнсаваў свае памылкі, змяніўся да лепшага і ўвогуле стаў больш дарослым і разумным чалавекам.

— Я ў добрай форме, хутка чэмпіянат свету ў Карэі, а ўвесну чэмпіянат Еўропы ў Беларусі, — працягвае Андрэй Арамнаў. — Тут, на вачах у беларусаў, я збіраюся пабіць свой жа сусветны рэкорд. Толькі настрой пакуль дрэнны. Можаце так і напісаць, што няма стымулу. А я вельмі хачу добра жыць у сваёй краіне і праслаўляць Беларусь на ўвесь свет.

Нагадаем, што Андрэй Арамнаў — лепшы спартсмен Беларусі мінулага года і найлепшы штангіст свету сярод усіх вагавых катэгорый.

Яўген ВАЛОШЫН.

ГРАН-ПРЫ «ТЭАТРАЛЬНАГА КУФРА» — У БЕЛАРУСАЎ

Галоўны прыз VI міжнароднага фестывалю студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар-2009», які ўручаецца па выніках рэйтынгавага галасавання гледачоў — атрымаў спектакль «Зімы не будзе» тэатра «На балконе» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Нагадаем, што праграма фестывалю ўключала 22 пастаноўкі тэатральных калектываў з Беларусі, Расіі, Англіі, Бельгіі, Літвы, Мексікі, Сербіі, Германіі, Ірана, Польшчы, Латвіі, Турцыі, Эстоніі і Славеніі.

Па меркаванні прафесійнага міжнароднага журы, самай яркай актрысай стала Джэсіка Харыет Бэйлі, якая іграла ў спектаклі «Шкада, што яна не распусніца» незалежнай тэатральнай кампаніі UWE Брыстольскага ўніверсітэта (Вялікабрытанія). Яна атрымала прыз за лепшую жаночую ролю. А яе каляжанка па пастаноўцы Вікторыя Эмілі Обры-Рыс узнагароджана прызам за лепшую жаночую ролю другога плана.

Прыз за лепшую мужчынскую ролю было вырашана аддаць Яўгену Фомчанкаву (спектакль «Салдацікі» мінскага незалежнага тэатра-студыі «Люстэрка»). Лепшым рэжысёрам стаў Уладзімір Цвеіч (спектакль «Урок» акадэмічнага тэатра «Branko Krsmanovic» Бялградскага ўніверсітэта). Прыз за лепшую сцэнаграфію быў уручаны Расэ Крыс-чынаўтэ (спектакль «Цень» тэатра-студыі Вільнюскага тэхнічнага ўніверсітэта). Работа ў тым жа літоўскім спектаклі Арнаса Пяткевічуса была ўдастоена ўзнагароды за лепшую мужчынскую ролю другога плана.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Выпрабавана на сабе: вайсковы вопыт

«БЫЦЬ ПА ФОРМЕ АБАВЯЗКОВА!..» ...ЦІ МАГЧЫМА?

Для студэнтаў айчынных ВНУ, якія вырашылі ў дадатак да грамадзянскай адукацыі атрымаць яшчэ і вайсковую спецыяльнасць, ёсць выключныя «прапановы» ваенных факультэтаў. Размова ідзе, зразумела, пра ваенныя кафедры. Некалі гэтыя «прапановы» мелі месца ва ўсіх ВНУ, але за часам развалу Савецкага Саюза, калі беларуская армія зменшылася з 280 да 60 тысяч, неабходнасць у іх па натуральных прычынах таксама зменшылася. І сапраўды, магло здарыцца, што афіцэраў у нашых узброеных сілах магло б быць у некалькі разоў больш за звычайных шараговых жаўнераў-салдатаў...

Але, як кажуць, маем што маем! А таму канстатуем, што цяпер толькі ў некаторых ВНУ, у якіх найчасцей ёсць свае ваенныя факультэты, прысутнічае магчымасць атрымання вайсковай спецыяльнасці: напрыклад, у БДУ, БДУІР, БДМУ...

Паступаюць на ваенную кафедру ў чацвёртым семестры — ад лютага да сакавіка. Найперш, студэнту-кандыдату неабходна прайсці медыцынскую камісію і падаць заяву на паступленне. Прычым праходзіць гэтую камісію лепш на пачатку лютага, бо ўсе дакументы вы зробіце не менш як за 3 тыдні ды, да таго ж, чэргі ў вашай паліклініцы ў выніку нядаўняга заканчэння прызыву будуць нашмат меншыя. А пасля атрымання прыдатнасці (а так хацелася сказаць: годнасці) наступае самая складаная частка, пра існасць якой вы даведаецеся толькі «па прыбыцці на ваенны факультэт» (такі выраз вы пачуеце яшчэ неаднойчы): гэта набыццё вайсковай формы.

І вы пачынаеце шукаць: найперш рушыце на мясцовыя рынкі. Там вы заўважыце шмат рыбацка-паляўнічай «спяцухі», якую з-за няведання вы не можаце пакуль адрозніць ад сапраўднай ваеннай. А таму крочыце ад крамкі да крамкі, пытаючыся пра наяўнасць сапраўднай вайсковай формы — на гэта вам адкажуць, што толькі ў адным-двух месцах яна ўвогуле прысутнічае. І нават у гэтых месцах, калі і знойдзецца што-небудзь сапраўднае, дык не таго памеру... Вам абяцаюць, што праз тыдзень будзе нешта новае!

Рабіць няма чаго: трэба шукаць спецыялізаваныя крамы. У, бадай, самай вядомай у рэспубліцы краме «Дом ваеннага адзення» вам адкажуць, што ўжо ўсё прададзена, а калі будзе невядома — ёсць толькі звычайная «кожнадзёнка». Вы шукаеце далей. Але вось ужо два тыдні штодзённых пошукаў прайшло, а нічога прыдатнага так і не знайшлося. Тады вы зноў едзеце на «Ждановічы» і зноў пытаецеся пра наяўнасць... няма! І просіце паказаць вам усе магчымыя, што як-ніяк падыходзяць па памеры. Купляеце... нібы нармалёва... але вось, заўважаеце, што штаны, падаецца, зараз трэснуць ад напругі... Вы зноў на «Ждановічах» — атрымоўваеце свае грошы назад...

І раптам вы вырашаеце, што найлепшым варыянтам будзе замовіць уласна пад свае габарыты. Дзеля гэтага вы накіроўваецеся зноў туды, дзе вы ўжо бывалі, бадай, разоў з дзесяць, дзе, як вам здаецца, абавязаны шыць ваенную форму... І там вы даведваецеся, што сапраўды тут яе шыюць... але не камуфляж! Далібог, вам даюць адрасы канкурэнтаў. І вы, ужо стомленыя ад гэтых вечных паходаў, нават забываецеся туды патэлефанаваць, а едзеце з дзіцячай спадзёўкай на абавязковасць...

Так праходзяць дні, тыдні — ужо не так шмат засталося і да прызначанага начальнікам кафедры часу, максімальнага тэрміну набыцця. І нарэшце, нейкім чынам (у кожнага па-свойму) да вас трапляе ў рукі доўгачаканая форма. Вы нават ужо і не звяртаеце ўвагі на дрэннае выкананне (таму ўласнаручна ў многіх месцах прашываеце яе яшчэ раз) і на дзіўныя хібы з кішэнямі, якіх на куртцы меней за патрэбнае... Але гэта нічога: галоўнае, вайсковая форма ўжо пры вас!

Мікола ТАМАШЭВІЧ.

ДЗЕ МОЖНА НАБЫЦЬ ФОРМУ?

Нягледзячы на тое, што існуе шмат прадпрыемстваў, што шыюць камуфляжную форму, толькі некаторыя з іх займаюцца яе вольным продажам фізічным асобам. Ніжэй названыя некаторыя крамы, дзе вы, найхутчэй, зможаце адшукаць (ці зрабіць пад замову) хоць больш-менш армейскае (і іншае спецыяльнае) адзенне:

У Мінску:

— «Дом ваеннага адзення», вул. Калініна, 30а

— «Армейскі буцік», вул. В. Харужай, 19

— «Армейскі», вул. Чкалава, 38, к. 2

— Рыбацкія павільёны і «Поле цудаў» на гандлёвым цэнтры «Ждановічы»

— «Шчыт», вул. Мяснікова, 11а

— «Спецадзенне», пр. Партызанскі, 48 і вул. Альшэўскага, 13

Калі вы не заўважылі неабходнага камуфляжу ў асартыменце гэтых крамаў, паспрабуйце пацікавіцца ў любых крамах і атэлье, назвы якіх будуць звязаныя з паляваннем, рыбалоўствам, спецыяльным прызначэннем, ваеннымі сімваламі...

ДЛЯ ЧАГО ЯНА ПАТРЭБНАЯ?

Акрамя заняткаў на ваенных спецыяльнасцях ваенная форма можа добра саслужыць у лесе падчас збірання грыбоў-ягадаў, на беразе возера падчас рыбалкі, у вандроўках і пад машынай, калі неабходна будзе што-нішто адрамантаваць. Увогуле ва ўсіх справах, звязаных з брудам, колкасцю і макрэчай.

КАШТАРЫС

На набыццё ўсёй неабходнай ваеннай формы ў вас пойдзе: мінімум 215 тысяч і максімум 320 тысяч рублёў (хоць пры жаданні выдаткі могуць быць большымі).

1) Фуражка камуфляжная (BYR 17.000) — неабходная рэч, як пры палявых занятках, так і пры стаянні на тумбачцы.

2) Нашыўка з абазначэннем факультэта (BYR 2.000) — абавязковая штука! Найхутчэй, вам яе абмяняюць на грашовыя адзнакі на самім ваенным факультэце.

3) Падшыўка «Каўнерык» (BYR 670) — што сказаць: «Па статуце належыць!» Гэтую дзіўную штуковіну, якую трэба мыць перад кожным днём «ваенкі», можна зрабіць і ўласнаручна са звычайнай бялізны.

4) Куртка камуфляжная (BYR 35.000 — 70.000) — як і штаны вельмі зручны элемент вайсковай формы, якую можна выкарыстоўваць і ў паўсядзённых умовах. Найбольшая зручнасць у колкасці і памерах кішэняў. У дадатак, варта сказаць, курткі бываюць як на гузіках, так і на маланцы, а таксама звычайная і лічбавыя (новая мадэль).

5) Рэмень (BYR 45.000) — без яго ніяк, бо і штаны будуць спадаць, і кашу за адсутнасцю сякеры ў экстрэмальных сітуацыях зварыць нельга будзе! Яны бываюць некалькіх відаў, але лепш набываць без бляхі, бо калі наадварот, дык прыдзіркі камандзіраў да дрэннай чысткі забяспечаныя. Да таго ж яны больш зручныя, бо можна падагнаць пад свой памер.

6) Штаны камуфляжныя (BYR 25.000 — 60.000) — прадаюцца ў камплекце з верхняй курткай. Проста зручна: нават калі вы не навучаецеся на ваенным факультэце, вельмі карысна ў нейкіх тэхнічных працах ды ў шматдзённых вандроўках.

7) Берцы (BYR 90.000 — 120.000) — зручны армейскі абутак, дзякуючы якому вашы ногі заўжды будуць сухімі і часткова абароненымі ад важкіх прадметаў. Пры выбары берцаў найперш звяртайце ўвагу на камфортнасць, каб яны задужа не ціснулі, але і не боўталіся — мазалі не вельмі прыемная рэч. У гэтым сэнсе, падаецца, можна ахвяраваць нават дадатковыя 30 тысяч.

Фота Аляксея КУЛЬБІЦКАГА.

КАРЫСНЫЯ ВЫСНОВЫ:

1. Праходзіць медыцынскую камісію для паступлення варта ў снежні—лютым, каб не спазніцца (хоць, як паказала практыка, тэрміны паступлення могуць пераносіцца нават на два-тры месяцы).

2. Шукаць форму лепш улетку, калі попыт маленькі, а прапанова наадварот дастатковая.

3. Лепш тэлефанаваць, чым крочыць!

4. Чым даражэй, тым лепш (часам сапраўды так — асабліва гэта датычыцца берцаў)!

5. Сярод іншых неабходных рэчаў было б няблага набыць і пляшку, каб застацца жывым падчас засушлівых вандровак.

6. Лепш за ўсё замовіць ваенную камуфляжную (!) форму па сваіх габарытах.

СВЯТА З САЛДАЦКАЙ КАШАЙ

У гэтую суботу мінскія вартаўнікі правапарадку дадуць магчымасць сталічным жыхарам і гасцям горада цікава правесці час на 33-й камбінаванай эстафеце, спаборніцтвы якой пройдуць на тэрыторыі Маскоўскага раёна ў скверы паміж праспектам Любімава і вуліцай Касманаўтаў.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, у міліцэйскай эстафеце возьмуць удзел прадстаўнікі ўсіх дзевяці раённых упраўленняў унутраных спраў і іншых падраздзяленняў ГУУС Мінгарвыканкама, а таксама ўнутраных войскаў. Спартыўная праграма, у якой міліцэйскія атлеты будуць спаборнічаць у прафесійным спрыце, сіле і выносліваці на 9 этапах эстафеты, урачыста пачнецца ў 11 гадзін. Тым часам глядачы і балельшчыкі змогуць атрымаць кансультацыі супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі. Акрамя таго, увазе гасцей свята будуць прапанаваныя прэзентацыйныя стэнды службаў міліцыі, эстрадная праграма, паказальныя выступленні супрацоўнікаў палка міліцыі спецпрызначэння, а таксама байцоў вайсковай часці 5448 і кінолагаў са службовымі сабакамі, выстава ўзбраення, спецыяльных сродкаў і тэхнікі. На свяце можна будзе пачаставацца і сапраўднай салдацкай кашай, а таксама аціаніць асартымент гандлёвых радоў ад мінскіх крамаў і прадпрыемстваў грамадскага харчавання.

Ігар ГРЫШЫН.

МІНСК ВЫРАСЦЕ ПРАЗ ДВА ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ ДА 542 км²

СКАРЭКТАВАНЫ генеральны план развіцця Мінска да 2030 года быў выстаўлены на абмеркаванне жыхароў сталіцы на працягу верасня. Кожны мог падысці ў будынак УП «Мінскграда», пацікавіцца, якой будзе сталіца праз 20 гадоў, а таксама пакінуць праекціроўшчыкам свае заўвагі і прапановы. Для тых чытачоў, якія не паспелі або не змаглі зазірнуць у будучыню сталіцы, мы папрасілі расказаць пра генеральны план развіцця Мінска Аляксандра Акенцьева, кіраўніка майстэрні генеральнага плана УП «Мінскграда»:

— Нам важна, калі мы будуем горад, каб усе элементы былі максімальна гарманізаваныя паміж сабой. Мэта планіроўшчыка і яго задача ў тым, што любое новае будаўніцтва, любая рэканструкцыя, любыя змены — за грошы ўсіх жыхароў праз падаткі, або за грошы прыватных забудоўшчыкаў, або за грошы інвестараў — усё новае не павінна замінаць і ўшчамляць правы іншых. Сёння мы падыходзім да стану, калі ў існых межах у нас рэзервы для развіцця горада вычарпаныя, мы сёння ўжо кажам пра вынаходніцтва, падпрыемствў, будуць займацца інвестары. Павелічэнне ўсіх відаў будаўніцтва, а мы плануем на перспектыву, што забяспечанасць жыллёвым фондам будзе 33 м²/чал. (сёння забяспечанасць жыллёвым фондам у сталіцы — 19,4 м²/чал., у еўрапейскіх сталіцах — каля 40 м²/чал.) патрабуе рэзервавання новых тэрыторый. Цяпер тэрыторыя Мінска — 30,7 тыс. гектараў, а на перспектыву нам трэба недзе каля 54 тысяч гектараў. І нам важна, каб тэрыторыі, якія трэба захаваць для горада, не забудоўваліся сельскагаспадарчымі аб'ектамі і на іх не развівалі сельскія населеныя пункты. Бо гарадскія нормы будаўніцтва істотна адрозніваюцца ад вясковых: там да гектара тэрыторыі можа займаць сядзіба, там іншая шырыня вуліц і забяспечанасць інжынернымі сеткамі і гэтак далей. Мы не забіраем гэтыя 24 тысячы гектараў у вобласці ці раёна, проста каб пазбегнуць потым дадатковых затратаў на перабудову, мы вызначаем, што на гэтых тэрыторыях трэба будаваць па гарадскіх нарматывах і цяпер.

— Аляксандр Рыгоравіч, колькасць транспарту расце пастаянна, генплан улічвае вырашэнне транспартных праблем?

— Вялікую ўвагу мы надаём развіццю інфраструктуры, і ў першую чаргу — транспартнай. У Мінска ёсць пэўная асаблівасць: ён будаваўся ў пасляваенны час і ў нас вельмі шмат мікрараёнаў, гэта вялікія тэрыторыі, па перыметры якіх ідуць вялікія вуліцы. А ў гарадах, якія будаваліся ў пачатку XX стагоддзя ці раней, традыцыйная структура кварталаў. І гэтую тэрыторыю арганізуюць вуліцы, звычайна невялікія, але яны забяспечваюць манеўранасць. А ў мікрараёнах усе аб'екты сядзяць на адной галіне мясцовага пад'езда, і ў гадзіну «пік» патрапіць кудысьці з-за суцэльнага патоку транспарту бывае цяжка. У Мінску добры паказчык магістральных дарог, але невысокі паказчык шчыльнасці агульнага сецівa вуліц і дарог, хацелася б, каб ён быў лепшы... Мы плануем будаўніцтва трох кольцаў унутры МКАДа і паўкальцавых за яе межамі, а таксама будаўніцтва транспартна-камунікацыйнага вузла на поўдзень ад горада: скрыжаванні калідораў № 9 (аўтамагістраль Берлін—Масква) і № 9Б (будучая аўтамагістраль Украіна — краіны Балтыі). Такім чынам, гэтыя дзве трасы забяруць ад горада ўвесь транзітны паток, а ў сам горад уезд будзе мэтанакіраваны. Пытанні транспарту вельмі важныя, мы кожны вузельчык у горадзе вывучалі. Будзе новая магістраль у бок аэрапорта «Мінск-2», запланаваная буйная магістраль у напрамку Гомеля, менш буйныя ў зону адпачынку Вяча (працяг вуліцы Карастаянавай), на Івянец пройдзе працяг вуліцы Громава, ну і таксама ёсць больш лакальныя праграмы. Таксама абавязкова патрэбны дублёры нашым галоўным праспектам — Незалежнасці, Партызанскаму, Дзяржынскага і іншым асноўным напрамкам, каб у нас заўсёды была магчымасць для манеўра.

— Ці звярталіся да практыкі будаўніцтва і праектавання іншых гарадоў, калі рабілі карэкціроўку генплана Мінска?

— Мы вельмі падрабязна вывучылі ўсе жылыя, вытворчыя, ландшафтна-рэкрэацыйныя тэрыторыі Мінска, сістэмы транспарту і гэтак далей. Бо вельмі важна ведаць унутраны стан і праблемы. Дакладна сфармуляваная праблема ўжо змяшчае ў сабе шлях да вырашэння. Нам было вельмі важна паставіць дыягназ: дзе найбольш слабыя і болевыя пункты, тэрыторыі, вузлы, часткі горада. Безумоўна, звяртаемся і да практыкі іншых гарадоў: і праз інтэрнэт, і праз літаратуру, хоць спецыяльных камандзіровак у нас не было... Мы зыходзім ад пераемнасці, мы лічым важнымі мясцовыя асаблівасці: намагаемся захаваць прыродны ландшафт, вадацёкі, складкі рэльефу. Мінск павінен захоўваць свае асаблівасці, павінен быць ні на каго не падобным, хоць, на жаль, элементы тыпавога праектавання ў нас таксама прысутнічаюць. Хацелася б, каб разнастайнасці было болей...

— За той час, калі генплан быў выстаўлены на абмеркаванне, якія-небудзь вельмі значныя і глабальныя прапановы ад мінчан прагучалі?

— Вельмі яркіх сустрэч, здаецца, не было. А так мінчанам важна, каб іх раён быў самы лепшы, самы багаты, каб у ім былі буйныя дарогі і інш. Гэта быў наш першы вопыт такога абмеркавання, і мы ўдзячныя жыхарам Мінска, што яны прыйшлі да нас — іх меркаванні і прапановы абавязкова будуць пачутыя, для нас яны вельмі важныя.

Гутарыў Павел БЕРАСНЕЎ.

— Плошча Мінска ў рамках перспектыўнай гарадской мяжы павялічыцца з 306 да 542 кв. км, колькасць насельніцтва — з 1,815 млн да 2,15 млн чалавек. Пры гэтым жыллёвы фонд павялічыцца ўдвая з 35,1 да 70,9 млн м2, таксама вырасце і сярэдні ўзровень жыллёвай забяспечанасці — з 19,4 м2/чал. да 33 м²/чал.

— Развіццё гарадскіх і раённых паркаў на плошчы больш за 2500 га будзе ажыццяўляцца ў зоне водна-зялёнага дыяметра горада на пойменных ландшафтах ракі Свіслач, у зоне «зялёнага кола» на прыродных ландшафтах Сляпянскай і Лошыцкай водна-зялёных сістэм, а таксама на перыферыі горада. Забяспечанасць зялёнымі насаджэннямі павялічыцца з 10,5 м²/чал. да 21 м²/чал.

— Адзін з прыярытэтных напрамкаў — развіццё вулічна-дарожнай сеткі і масавага пасажырскага транспарту. Будзе працягнута фарміраванне радыяльна-кальцавой структуры магістральных вуліц і дарог, толькі да 2015 года патрабуецца будаўніцтва і рэканструкцыя 150 км гарадскіх вуліц і каля 30 транспартных пуцеправодаў і развязак. Узровень аўтамабілізацыі ўзрасце з 242 маш./1000 чал. да 350 маш./1000 чал.

— Агульная працягласць ліній Мінскага метрапалітэна да 2030 года дасягне 56 км.

У Беларусі лепшы рэйтынг у СНД

ДНЯМІ Праграма развіцця ААН распаўсюдзіла апошнія звесткі рэйтынгу індэкса развіцця чалавечага патэнцыялу (ІРЧП). Пракаментаваць вынікі гэтага міжнароднага даследавання мы папрасілі кіраўніка дэпартамента грамадскай інфармацыі прадстаўніцтва ААН у Беларусі Віктара Радзівіноўскага.

— Спачатку нагадаю, што ІРЧП — гэта сумарны паказчык узроўню развіцця чалавека ў канкрэтнай краіне. З дапамогай ІРЧП ацэньваюцца сярэдняя дасягненні краіны па трох асноўных вымярэннях: даўгалецце і здароўе (вымяраецца паказчыкам чаканай працягласці жыцця пры нараджэнні), доступ да адукацыі (вымяраецца ўзроўнем пісьменнасці дарослага насельніцтва і сукупным валавым каэфіцыентам ахопу адукацыяй), прыстойны ўзровень жыцця (вымяраецца велічынёй ВУП на душу насельніцтва ў доларах ЗША па парытэце пакупной здольнасці). Гэтыя тры вымярэнні стандартызуюцца ў выглядзе лічбавых значэнняў ад 0 да 1. У гэтым дыяпазоне і вызначаецца індэкс развіцця чалавечага патэнцыялу.

Тры лепшыя паказчыкі ў рэйтынгу ў Нарвегіі, Аўстраліі і Ісландыі. Яны і яшчэ 35 краін уваходзяць у групу з вельмі высокім узроўнем развіцця чалавечага патэнцыялу.

Беларусь па сваіх паказчыках не толькі захавала месца ў групе краін з высокім узроўнем ІРЧП, але і ўзнялася на адну прыступку: яе 68-е месца — самы лепшы паказчык сярод краін СНД. У Расіі, напрыклад, 71-е месца. Казахстан — на 82-м. Украіна, якая знаходзіцца ў ніжэйшай групе краін з сярэднім узроўнем ІРЧП, у агульным спісе займае 85-е месца. Малдова — на 117-м, Узбекістан — на 119-м, Кыргызстан — на 120-м, Таджыкістан — на 127-м месцы.

Гэты самы апошні ІРЧП быў разлічаны для 182 краін і складзены Праграмай развіцця ААН у рамках даклада ААН «Праблема бар'ераў: чалавечая мабільнасць і развіццё» на аснове статыстычных звестак за 2007 год. Таму ён не адлюстроўвае вынікі ўплыву глабальнага фінансавага і эканамічнага крызісу, які, безумоўна, адмоўна паўплываў на дасягненні ў развіцці чалавека ў многіх краінах.

Леанід ТУГАРЫН.

ПАЙШОЎ У ГРЫБЫ І ПАКУЛЬ НЕ ВЯРНУЎСЯ...

Усе шукаюць 74-гадовага мужчыну, які 1 кастрычніка пайшоў у лес па грыбы з вёскі Сярэднія Печы Лельчыцкага раёна. Міліцыянеры, выратавальнікі і мясцовыя жыхары абышлі на гэты момант лясны масіў, куды, як мяркуецца, накіраваўся стары чалавек, але ж пенсіянера знайсці пакуль не атрымалася.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

80 ГАДОЎ ТАМУ Ў МІНСКУ АДБЫЎСЯ ПРОБНЫ ПУСК ПЕРШАГА ТРАМВАЯ

Рэгулярны рух гэтага віду электратранспарту пачаўся 13 кастрычніка 1929 года. Увогуле першыя трамваі павінны былі пайсці па мінскіх вуліцах яшчэ ў 1914 года, але Першая сусветная вайна парушыла гэтыя планы.

На момант адкрыцця сістэма ўключала два маршруты: «Таварная станцыя — Камароўка» (13 прыпынкаў: 9 пастаянных і 4 па запатрабаванні) і «Вакзал — плошча Свабоды» (3 прыпынкі, 2 з іх пастаянныя). Выкарыстоўваліся вагоны КМ вытворчасці Мыцішчынскага завода. Выпуск на лінію тады складаў 5 вагонаў. Транспартам штодня карысталіся 18—19 тысяч пасажыраў.

Цяпер на вуліцах беларускай сталіцы курсіруюць больш за паўтары сотні адзінак гэтага экалагічна чыстага віду транспарту. Працягласць маршрутнай сеткі складае амаль сто кіламетраў.

Віктар КУШНАРОЎ.
«Мінск—Навіны».

Пакуль не чараўнікі, а толькі вучацца

ТАК могуць сказаць пра сябе маладыя музыканты, якія прыехалі ў Мінск з васьмі краін постсавецкай прасторы павышаць майстэрства.

Хоць кожны з іх ужо можа зачараваць сваёй ігрой — на Міжнародны музычны фестываль у Мінск іх накіравалі зусім невыпадкова. Таленавітыя, працавітыя, адметныя — яны вартыя сваіх сусветна вядомых выкладчыкаў, з якімі маюць магчымасць кантактаваць у гэтыя дні і займацца ў іх. З удзельнікамі Моладзевай акадэміі ў рамках фестывалю Башмета дзеляцца досведам зоркі выканальніцкага майстэрства, якія ведаюць, чаго вартае прызнанне публікі. Педагогамі акадэміі сёлета сталі тыя, хто вядомы як музыкант і педагог, як, напрыклад, рэктар Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі віяланчаліст Сяргей Родулгін, прафесар Кёльнскай вышэйшай школы музыкі піяніст Васіль Лабанаў, альтыстка з Германіі Дзімут Папэн, піяніст з Азербайджана Мурад Адзігілзадэ ды іншыя. Педагогі мелі магчымасць паказаць сябе ва ўсім бляску — яны выступілі ў асобным канцэрце

У Вялікай зале Беларускай акадэміі музыкі прайшла сустрэча і адбыўся майстар-клас па класе альта і камернай музыкі з прафесарам вышэйшай школы г. Дэтмольта Германіі Дзімут ПАПЕН (на фота) са студэнтамі, выкладчыкамі, удзельнікамі канцэрта Моладзевай акадэміі краін СНД.

на сцэне Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

З майстрамі-педагогамі акадэміі сустрэліся студэнты Беларускай акадэміі музыкі: цікава было паслухаць іх думкі пра тое, што ёсць музычная справа і як можна дасягнуць поспеху. Асабліва калі пра гэта разважаў галоўны герой фестывалю, уладальнік «Грэмі» Юрый Башмет, ці выдатны скрыпач, народны артыст СССР Віктар Траццякоў.

Закрыецца Міжнародная акадэмія 10 кастрычніка канцэртам у Белдзяржфілармоніі. Цяжар закрыцця своеасаблівай навучальнай установы Міхаіл Швыдкой падзеліць з Башметам. Усё-такі Юрыю Абрамавічу выпадае закрываць і сам фестываль у Мінску — з ансамблем «Салісты Масквы», між іншым разам з імі на сцэну выйдуць беларускія скрыпачы Сцяпан Яковіч, Андрэй Паскробка, салістка Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра Рэспублікі Беларусь Настасся Масквіна.

Ларыса ЦІМОШЫК.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Сваё майстэрства ігры на альце змаглі паказаць усе ахвотныя.

АСАБІСТЫЯ ЗВЕСТКІ ЗАСТАНУЦЦА ТАЙНАЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Калі няма жадання?

Паводле заканадаўства, рэспандэнты абавязаныя не перашкаджаць перапісу насельніцтва і запаўняць перапісныя аркушы. Адказнасці за адмову ад апошняга не прадугледжваецца. У горшым выпадку перапісчык проста прапусціць «непажаданае» пытанне. Аднак, мяркуюць у Нацыянальным статкамітэце, грамадзяне Беларусі паставяцца да акцыі з разуменнем — тым больш, што пытанняў аб памерах даходаў ці якіх-небудзь камерцыйных тайнах не прадугледжваецца. Не будзе, падкрэслівае Святлана Навасёлава, і далейшай «уцечкі» інфармацыі.

Дарэчы, па сцвярджэннях прадстаўнікоў Нацыянальнага статкамітэта, сам працэс перапісу павінен быць непрацяглым. У сярэднім перапісчык будзе знаходзіцца ў кватэры 10—15 мінут.

Куды пойдзе інфармацыя?

Адначасова Святлана Навасёлава заўважыла: кожнаму чалавеку гарантуецца поўная канфідэнцыяльнасць персанальных звестак. Пры апрацоўцы ўсе персанальныя звесткі будуць «абезасобленыя». Адпаведна, надалей стануць распаўсюджвацца толькі «зводныя» звесткі — па краіне, раёне, населеным пункце ў цэлым. Таму даступнай стане выключна «агульная» інфармацыя. І ў тым ліку — для падаткавікоў і органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

— Увесь персанал, які будзе мець доступ да перапісных лісцтоў, падпісвае абавязацельства аб невыдаванні інфармацыі і папярэджваецца аб адказнасці за парушэнне гэтага абавязацельства, — працягвае Святлана Навасёлава. — Апроч таго, вызначаныя канкрэтныя асобы, якія адказваюць за абарону персанальных звестак ужо на этапе іх апрацоўкі.

А што з двухмоўем?

Адно з пытанняў будзе датычыцца роднай мовы. Гэта — зноў-такі справа самавызначэння грамадзян. Прычым самі перапісныя лісты надрукаваныя як па-руску, так і па-беларуску. А самі перапісчыкі (да слова, іх агульная колькасць складзе 38 тыс. чалавек) прайшлі папярэдняе навучанне рабоце з аркушамі на беларускай мове.

Чаму няма пытання аб рэлігіі?

Для участия в аукционе в срок до 16.00 6 ноября 2009 г. по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, каб. 401 предоставляются следующие документы:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – копии (без нотариального засвидетельствования) устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, и свидетельства о государственной регистрации, доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), копия выданной Министерством финансов Республики Беларусь лицензии на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности на рынке ценных бумаг (профессиональными участниками рынка ценных бумаг);

индивидуальными предпринимателями – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации;

представителями физических лиц, индивидуальных предпринимателей – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенная доверенность;

юридическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

представителями физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность, представителями юридических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность или иные легализованные в установленном порядке документы, подтверждающие полномочия представителя;

документ, подтверждающий согласие антимонопольного органа на совершение сделки, в случаях, установленных законодательством Республики Беларусь.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предоставляют копию документа, удостоверяющего личность, и его подлинник для заверения его копии лицом, принимающим документы.

Для участия в аукционе уплачивается задаток в сумме 7853915 (семь миллионов восемьсот пятьдесят три тысячи девятьсот пятнадцать) белорусских рублей на счет № 3642974000028 в филиале № 529 «Белсвязь» ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 720; получатель платежа – Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, УНП 102314789.

Задаток уплачивается в срок до 19 ноября 2009 г. согласно договору о задатке, заключаемому с Фондом государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь при регистрации заявления на участие в аукционе.

Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее за пакет акций (лот) наиболее высокую цену.

Договор купли-продажи акций заключается с участником аукциона, выигравшим торги, в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона.

Участник аукциона, выигравший торги, обязан возместить фактические затраты на подготовку и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Получить более подробную информацию об ОАО «Борисовбытспецсервис», ознакомиться с проспектом эмиссии и годовой бухгалтерской отчетностью акционерного общества по состоянию на 1 января 2009 г., проектом договора купли-продажи акций можно по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, каб. 401.

Контактные телефоны:

Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (017) 284 85 62.

Департамент ценовой политики Министерства экономики (017) 200 68 45, 222 67 17, 222 67 72.

Полное и сокращенное наименования открытого акционерного общества, его адрес	Уставный фонд, шт. акций	Номинальная стоимость акции, рублей	Доля государства в уставном фонде		Предлагается для реализации		Начальная цена		Лот № 1		Информация о владельцах крупных пакетов акций (5 и более процентов уставного фонда)
			кол-во акций, шт.	в % к УФ	кол-во акций,	в % к УФ	акции, рублей	пакета акций, рублей	количество акций в лоте, штук	начальная цена лота, рублей	
Открытое акционерное общество «Борисовбытспецсервис» (ОАО «Борисовбытспецсервис»), Минская обл., г. Борисов, ул. имени братьев Вайнрубов, 7	10635	4200	5093	47,9	5093	47,9	15421	78539153	5093	78539153	Владельцы крупных пакетов акций отсутствуют

За ОАО «Борисовбытспецсервис» зарегистрированы земельные участки общей площадью 2,6925 га в г. Борисове.

МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 10 НОЯБРЯ 2009 г. ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАН РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В МИНСКОМ РАЙОНЕ

		Лот 1	Лот 2	Лот 3	Лот 4	Лот 5	Лот 6	Лот 7	Лот 8	Лот 9
1	**Адрес земельного участка**	Петришковский с/с, д. Новашино	Петришковский с/с, д. Новашино	Петришковский с/с, д. Новашино	Петришковский с/с, д. Новашино	Щомыслицкий с/с, д. Антонишки	Сеницкий с/с, д. Леонтьевичи	Лошанский с/с, д. Бровки	Лошанский с/с, д. Бровки	Лошанский с/с, д. Прудище
2	**Кадастровый номер**	623685707101000160	623685707101000131	623685707101000141	623685707101000143	623688000101000057	623686603101000104	623684001601000233	623684001601000234	623684007601000061
3	**Площадь земельного участка**	0,1527 га	0,1546 га	0,1635 га	0,1622 га	0,1547 га	0,1390 га	0,2447 га	0,2236 га	0,2060 га
4	**Целевое назначение**	для строительства и обслуживания жилого дома	для строительства и обслуживания жилого дома	для строительства и обслуживания жилого дома	для строительства и обслуживания жилого дома	для строительства и обслуживания жилого дома	для строительства и обслуживания жилого дома	для строительства и обслуживания жилого дома	для строительства и обслуживания жилого дома	для строительства и обслуживания жилого дома
5	**Расходы по подготовке документации (рублей)**	70 000	70 000	70 000	70 000	503 370	779 789	498 300	498 299	503 665
6	**Начальная цена земельного участка (рублей)**	15 000 000	15 187 000	16 060 000	15 933 000	50 702 925	22 825 120	17 646 345	16 124 735	12 798 842
7	**Задаток (рублей)**	1 400 000	1 500 000	1 600 000	1 500 000	5 000 000	2 200 000	1 700 000	1 600 000	1 200 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 10.11.2009 г. в 9.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов 04.11.2009 г. в 17.00. Контактный телефон: (8 025) 92 761 92.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1, 2, 3, 4 перечисляется на расчетный счет Петришковского сельисполкома № 3600621130151 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, код 520, УНН 600052386.

На Лот 5 – на расчетный счет Щомыслицкого сельисполкома № 3600621180202 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600537220, ОКПО 04432966, код платежа – 04901.

На Лот 6 – на расчетный счет Сеницкого сельисполкома № 3600621160189 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052409, ОКПО 04432966, код платежа – 04901.

На Лоты 7–9 – на расчетный счет Лошанского сельисполкома № 3600621060087, ф-л № 614 АСБ «Беларусбанк», код 520, г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600228670, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

По решению комиссии участники аукциона, не выигравшие аукцион в отношении земельных участков, на которые они подали заявления, в перерывах между аукционными торгами могут перерегистрироваться на другие земельные участки, по которым размер задатка не превышает суммы, внесенной ими в качестве ранее перечисленного задатка. Для перерегистрации участники аукциона представляют заявления.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона. В этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней, после признания аукциона несостоявшимся, принимает решение о предоставлении ему земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин, юридическое лицо обязаны внести плату за земельный участок в размере его кадастровой стоимости, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы необходимые для участия в аукционе:

1. заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

2. заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет;

3. гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.26	18.27	11.01
Віцебск —	7.17	18.15	10.58
Магілёў —	7.16	18.17	11.01
Гомель —	7.11	18.15	11.04
Гродна —	7.41	18.42	11.01
Брэст —	7.40	18.45	11.05

Месяц

Апошняя квадра 11 кастрычніка. Месяц у сузор'і Блізнятаў.

Імяніны

Пр. *Уладзіміра, Івана*

К. *Анастасіі, Арнольда, Багдана, Вінцэнта, Людвіка, Яна*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.



Дзве даты

9 кастрычніка

1596 год — на Брэсцкім царкоўным саборы (праходзіў 6—10 кастрычніка) была прынята Брэсцкая царкоўная унія — акт аб'яднання праваслаўнай і каталіцкай царквы на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Беларускія і ўкраінскія праваслаўныя ўладыкі прызналі вяршэнства папы рымскага, але захавалі пры гэтым усе ранейшыя абрады. Галоўнай прычынай заключэння уніі было імкненне да кансалідацыі царкоўных і свецкіх кіраўнікоў ВКЛ і Польшчы. Унія спыніла дзеянне ў 1839 годзе.

1708 год — у час бітвы каля вёскі Лясная на Магілёўшчыне рускія войскі Пятра I разгромілі шведскі корпус Левенгаўпта, які ішоў на Палтаву, каб злучыцца з арміяй Карла XII.

Цытата дня:

«Трэба ўмець трываць тое, чаго нельга пазбегнуць».

Мішэль дэ Мантэнь (1533—1592), французскі філосаф-гуманіст.

БУЛЬБА

Бульба адносна нядаўна з'явілася на тэрыторыі пражывання ўсходніх славян, прыкладна ў XVIII стагоддзі. Доўгі час яна лічылася «чужой», «д'ябальскай» раслінай. У стараверскіх тэкстах бульбу, чай і тытунь называлі «антыхрыставымі» раслінамі. І толькі ў XIX стагоддзі бульбу сталі ўжываць у ежу, спазнаўшы яе смакавыя і нават лекавыя якасці. З тых часоў бульба ва ўсходніх славян стала «другім хлебам»: «Бульба — хлебу дапамога», «Людзі на бульбе і капусце жывуць».

● У нашых продкаў калісьці быў такі звычай: пасля заканчэння першага дня збірання бульбы на полі раскладалі вогнішча і пяклі бульбу новага ўраджаю. Лічылася: калі пагрэць рукі аб гарачую бульбіну, яны не будуць мерзнуць узімку.

● У некаторых рэгіёнах пры заканчэнні збору бульбы пяклі бульбяныя бліны з морквай. На Палессі ў гэты дзень да святочнага стала абавязкова рэзалі пеўня.

● Паўсюдна было прынята крыху бульбы пакідаць на полі — каб улагодзіць «бульбянога бога» — «Анчутку-бульбяніка».

● У склеп бульбу апускалі ў той дзень тыдня, на які прыпадала свята Пакровы. Тады бульба не будзе гнісці.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

— Вось ты ў нас турыст, паходнік. Скажы, куды на выхадныя можна схадзіць па грыбы? Толькі каб не вельмі далёка, і каб гарантавана на патэльню набраць.

— На кірмаш да бабулек...

☺

Мы з катом вывучылі новую каманду: калі я здымаю тапак, ён заскоквае на падваконне і затыкаецца.

☺

Ён і яна.

— Калі табе зараз сумна, прыязджай. Ці я прыеду да цябе.

— Давай лепш ты. Мне далей ехаць.

☺

У граніта навукі, як правіла, смак «Ролтана», радзей — пельменяў.

☺

— На рабоце інтэрнэт адключылі — дай, думаю, пайду сабе гарбаты заварю. Выходжу ў калідор, а там чалавек 20 з такімі думкамі.

— Перапіс гультаёў адбыўся паспяхова.

☺

Няма такой жанчыны на свеце, якой бы не ўдалося сказаць «бывай» менш чым у 30 словах.

ПАДПАЛЬШЧЫКА СЕНАСХОВІШЧА ШУКАЮЦЬ

Пажарныя выратавалі ад агню 20 тон сена пры тушэнні сенасховішча ў Міёрскім раёне. На жаль, 30 тон сена «з'еў» агонь. Знішчаны дах і сцены сенасховішча.

Збудаванне, што належыць сельскагаспадарчаму вытворчаму кааператыву «Мікалаеўскі», знаходзіцца ў вёсцы Шарагі . Пра пажар а шостай гадзіне вечара паведаміў па тэлефоне «101» мясцовы жыхар.

Мяркуецца, што сенасховішча падпалілі. Тэрыторыя, на якой яно знаходзіцца, не мае агароджы і нікім не ахоўваецца. Вінаватага ў падпале шукаюць. Падлічана папярэдняя страта ад пажару — пад 4 мільёны рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Ліры і дуды Алеся Лася

МАЙСТАР З БАРКА АДНАЎЛЯЕ СТАРАДАЎНІЯ ІНСТРУМЕНТЫ І ЛАДЗІЦЬ ЭКСТРЭМАЛЬНЫ ТУРЫЗМ

Алесь Лось лічыць, што ў гэтых маляўнічых мясцінах і дуда па-іншаму гучыць.

АЛЕСЬ Лось — асоба вядомая. І не толькі на Валожыншчыне, дзе ён апошнім часам абуладкаваўся, і па ўсёй Беларусі, але і далёка за межамі нашай краіны. Алесь заўжды ў руху: асвойвае новае, займаецца творчасцю — карацей кажучы, ніколі не сядзіць на месцы. Цяпер жыве практычна ў лесе — да яго сядзібы можа дабрацца толькі чалавек дасведчаны. З добрай асфальтавай магістралі паварочваем на праклад-зеную ў гушчары дарогу і праз хвілін дзесяць — ужо на месцы...

Вяртанне батлейкі

Гаспадар ветліва выходзіць сустракаць нечаканых гасцей: я загадзя не дагаворваўся аб прыездзе і патэлефанаваў Ласю толькі мо гадзіну таму. Але Алесь на прапанову аб размове адразу адказаў: «А чаму б і не». І цярпліва патлумачыў няпросты маршрут. Удакладняць дарогу не давялося, паколькі ўсе арыенціры былі вызначаны дакладна. І вось падворак Лася: на палянцы каржакаватае дрэва быццам закідвае свае разлапістыя галіны прама ў чырвоныя перадвячэрнія аблокі і побач — невялікая хатка. Быццам час імгненна адкруціўся сама меней на паўстагоддзя таму. І шалёны рытм сучаснасці страціў свой уплыў, як прапала надакучлівая мабільная сувязь. Адчуванне — проста фантастычнае.

— Што, таксама праняло? — Алесь з разуменнем зазірнуў мне ў вочы. — То скідвайце хутчэй сваю гарадскую загазаваную «скуру». Будзем піць гарбату ўтраіх разам з Мурзікам (вялікі кот туліцца побач і пагаджаецца з гаспадаром — выгінае спіну) і нетаропка размаўляць. Радня Ласёў родам з Вуглянаў — гэта некалькі кіламетраў ад Радашковічаў. Таму я добра ведаю тутэйшыя мясціны, хоць сам нарадзіўся і доўгі час жыў у Мінску. У сталіцы закончыў мастацкую школу.

Пасля была вядомая мастацкая вучэльня імя Глебава, Акадэмія мастацтваў, дзе Алесь Уладзіміравіч займаўся на аддзяленні графікі. Лось з цікавасцю асвойваў тэмперны жывапіс, працаваў з інтэр'ерамі (праз колькі часу ён зрабіў 7 іканастасаў для цэркваў). Алесь з сям'і мастакоў: бацька — графік, а маці — акварэліст, адраджала традыцыі саломкі. Дарэчы, і дзед добра маляваў, так што выбар майго знаёмца — даніна сямейнаму занятку. Але не толькі: хіба б займаўся Алесь тым, што яму не падабаецца?

Яшчэ падчас вучобы ў Акадэміі пачаў цікавіцца батлейкай. Калі атрымаў дыплом, то яны разам з жонкай не імкнуліся застацца ў сталіцы (хоць такая магчымасць была), а нечакана для ўсіх з'ехалі ў вёску Зарудзічы, што на Смаргоншчыне. Месца адметнае — побач, у Залессі, палац Агінскага, дзе яны арганізавалі свой першы праект па адкрыцці школы мастацтваў. Знайшлі паразуменне і падтрымку ў міністэрствах адукацыі і культуры, пачалі актыўна займацца рэканструкцыяй гістарычнага будынка. Аднак, на жаль, хутка ўсё скончылася. Але для Алеся гэта шмат у чым быў пачатак доўгага шляху.

— Менавіта батлейка падштурхнула мяне да таго, каб прафесійна займацца вырабам інструментаў — ліраў, дудаў, флейтаў, жалеек, — заўважае Алесь Лось. — Батлейка — гэта сінтэз мастацтва, у ёй арганічна спалучаецца музыка, акцёрскае майстэрства, мастацкі густ, дыкцыя і шмат чаго яшчэ. Яшчэ ў дзяцінстве я спрабаваў майстраваць прымітыўныя дудкі.

Пяць сакральных дрэў

Лось узгадвае: падчас «залескіх» часоў у яго заўжды побач з пэндзлямі, фарбамі, палотнамі і крэйдамі заўсёды былі габэлькі, тачылы, станкі, стамескі — для вырабу музычных інструментаў. Сваю першую дуду майстар пачаў рабіць дзесьці ў 1982-м і скончыў толькі праз некалькі гадоў. Рухаўся крок за крокам, навобмацак, паколькі старадаўнія традыцыі былі забытыя. Алесю даводзілася бачыць дударoў, але ў тыя часы, калі сам вырашыў зрабіць інструмент, то

На старым здымку 1920-х гадоў: паслухаць лірніка збіраліся і старыя, і малыя.

патрэбных настаўнікаў было не знайсці. З цягам часу Лось зрабіўся прызнаным аўтарытэтам беларускага дударства. Ён выраблял ўсе тры тыпы дудаў, якія калісьці былі распаўсюджаны на тэрыторыі Беларусі.

— Гэты інструмент атрымаў сваё жыццё падчас кельцкай цывілізацыі, якая існавала на абшарах не меншых, чым цывілізацыя вузкагорлых амфар, — кажа майстар. — Яна мела геасакральны характар і, што цікава, дагэтуль захавалася шмат супольных рэчаў. Дзік — кельцкі сімвал сонца, і яго рыносюць у аховяру на Каляды. І свінней колюць не таму што мароз, а таму што так прынята спрадвеку. Гэтай традыцыі некалькі тысячагоддзяў. Альбо галаўшчызна (запечаная галава кабана) — таксама кельцкая страва. Так што дуда з'явілася вельмі даўно і цяпер розніца паміж адпаведнымі інструментамі ў розных краінах — у этнаграфічных традыцыях.

Алесь не імкнецца поўнасцю аднавіць увесь працэс вырабу дуды, які існаваў калісьці. Скуру набывае, а далей, зразумела, усё робіць сам. Драўляныя часткі — з чачоту (карэльскай бярозы). Але для таго, каб атрымаць гукі патрэбнай барвы, выкарыстоўвае і іншыя пароды дрэў (кожная з іх па-свойму рэзануе). Вельмі падабаецца яму ліпа. Лось пераважна шукае «перуновыя дрэвы» — якія былі звалены маланкай альбо збітыя бурай. За ўвесь час зрабіў больш чым тры дзясяткі дудаў і многіх навучыў граць.

— Калі дуда добра зроблена, то будзе мець адметнае гучанне і доўга служыць, — пераканаць Лось. Я не працую як мануфактура, таму магу скончыць працу за месяц, а магу і год шчыраваць. Калі праца не ідзе, то я адкладваю яе ўбок. Практычна ўсе матэрыялы для вырабу інструментаў толькі сам нарыхтоўваю. Вы, напрыклад, ведаеце, што існуюць пяць сакральных дрэваў, якія маюць душу?

— Першы раз чую...

— Вось, а між тым да такіх нашы продкі залічвалі бярозу, клён, дуб, ліпу і вярбу. У многіх алфавітах літары маюць зашыфраванае пасланне наконт таго, як дрэвы злучаюць неба і зямлю. Гэта толькі здаецца, што ўсё проста: дрэвы — толькі «кавалак драўніны», а насамрэч яны надзелены магічнай сілай і ўздзейнічаюць на чалавека. Кожны з нас, дарэчы, гэта падсвядома адчувае, толькі як след асэнсаваць не можа.

Па слядах ледавіка

Месца, дзе жыве Алесь Лось, называюць Барок. Яно і не дзіўна — адразу можна заўважыць, што не так даўно людзі адваявалі гэты лапік зямлі ў лесу. Дом стаіць на даволі высокім пагорку, і з вокнаў відаць заліўны луг — Гумбаўка. З балцкай гэта перакладаецца як «паўвостраў» ці «выступ». У даўнія часы тут рухаўся ледавік і ў гэтых мясцінах ён як быццам «агарнуў» пэўную тэрыторыю. Атрымалася, што такім чынам захаваліся рэдкія расліны, іх магчыма сустрэць і сёння. Сапраўды ўнікальны куток, нездарма ім зацікавіліся навукоўцы. Падчас паводкі лужок Гумбаўка хаваецца пад вадой — толькі галінкі дрэў тырчаць. Рэчка Яршоўка разліваецца шырока. Проста казачныя мясціны!

Гаспадар Барка кажа, што і цяпер раніцой нярэдка казулі і алені на Гумбаўцы пасвяцца. Але жывёлы ўжо не столькі, як нават пасля Вялікай Айчыннай заставалася, калі сюды часта Якуб Колас прыязджаў. Пясняр сябраваў з Міхалам Цішковічам, тут працаваў над сваімі творамі. Захаваўся нават дубовы стол, за якім пісаў Колас. Тутэйшыя землі адметныя і тым, што тут спрадвеку шляхта сялілася. Шмат годных людзей засталося і дасюль. Акрамя дудаў Алесь Лось таксама займаецца вырабам такога цікавага і, на жаль, цяпер забытага інструмента, як ліра. Адпаведны музычны жанр звязаны яшчэ з дахрысціянскімі часамі. Лірнікі — гэта былі чараўнікі, якія не толькі гралі, але і варажылі, напрыклад, па палёце птушак. У Беларусі калісьці былі цэлыя вёскі, якія лірамі займаліся. Былі і вандроўныя групы лірнікаў, дарэчы, даволі вялікія — па 20—50 чалавек. Гэтыя музыкі займаліся справай прафесійна, нават падаткі дзяржаве з заробкаў плацілі. У іх была і свая мова, якую іншыя не маглі зразумець. Лірнік, Старац, Дзед сляпы, Кабзар — так называлі тых, хто вандраваў з ліраю і спяваў. Гэтых музыкаў вельмі паважалі і шанавалі. Паўсюль яны былі жаданымі гасцямі. У кожнай хаце, нават невялікага дабрабыту, заўсёды быў запас ежы «на старцаву дольку». Да пачатку мінулага стагоддзя засявалася палоска жыта для Дзядоў. Яшчэ ў 1945—1946 гадах лірнік граў і спяваў на Камароўскім рынку ў Мінску. Нават пазней музыкаў можна было сустрэць на Піншчыне.

— Некалі ў дзяржаўным музеі гісторыі была вельмі цікавая зала народных інструментаў, — узгадвае Алесь Лось. — Там захоўвалася ліра, якая была зроблена з дубу. Можна разумець такі выбар, бо дуб — дрэва Перуна. Аднак я раблю ліры па старадаўніх канонах: «плечы» — з авору (клёну), «грудзі» — з елкі. Здараецца выкарыстоўваю каштоўныя пароды дрэва для аздаблення.

Цяпер Алесь робіць чарговую ліру — інструмент ужо набыў сваю форму і праз пэўны час набудзе непаўторнае гучанне. Пакуль жа ў вольны час майстар любіць пайграць на дудзе. Здараецца, праводзіць майстар-класы па вырабе народных інструментаў для сваіх гасцей, якія прыязджаюць да яго на сядзібу. Спецыяльных умоў для размяшчэння турыстаў Алесь не ствараў: у Барок імкнуцца патрапіць людзі, якія выбіраюць актыўны адпачынак. Яны начуюць у намётах і палатках, вучацца выжываць у даволі экстрэмальных умовах. Магчыма, толькі такім чынам і можна рэальна вярнуцца ў слынную мінуўшчыну, дакрануцца да сваіх каранёў. Толькі шкада, што такіх месцаў застаецца ўсё менш.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Валожынскі раён.

ДЗЕ Я? У НОВЫМ ТЭАТРЫ!

Падчас адкрыцця тэатра.

Сёння новы драматычны тэатр сталіцы адкрывае свой першы сезон пасля рэканструкцыі, якая цягнулася некалькі доўгіх гадоў. Ён вядзе сваю гісторыю ад тэатра-студыі «Дзе-Я?», які ўзнік у другой палове 80-х мінулага стагоддзя і надалей набыў статус дзяржаўнага сталічнага тэатра і новую назву.

Рэпертуар тэатра ўнікальны. Тут ёсць спектаклі, якія ніколі раней не бачылі тэатральных падмосткаў. Гэта прыгожы, паэтычны пераклад Петрусём Макалём «Рамантыкаў», «Чароўная скрыпка» Алеся Гаруна. Сёлета гледачы ўбачаць «Жанчыне не забароніш», Ж. Ануя, «Зацюканы апостал» А. Макаёнка, «Чай з вярблюдам» Г. Марчука, і іншыя п'есы беларускіх і замежных аўтараў. Пры тэатры паспяхова працуе першая ў краіне дзіцячая тэатральная школа. З удзелам юных артыстаў і для юных гледачоў ідуць спектаклі «Зачараваная прынцэса» Б. Сударушкіна, «Новыя прыгоды старых знаёмых» П. Васючэнкі.

Дырэктар тэатра Васіль Марцецкі і творчы калектыў імкнуцца, каб тэатр меў і надалей адметны, самабытны твар, унікальны рэпертуар. Каб па тэатр ведалі не толькі ў сталіцы, краіне, але і далёка за яе межамі.

Марыя ЖЫЛІНСКАЯ. Фота аўтара.

«ЛЮДЗІ БЫЛІ І ЗАСТАЮЦЦА ГАЛОЎНЫМ БАГАЦЦЕМ»

НЕАДНАРАЗОВА даводзілася чуць, што ў вёсцы пануе «кадравы голад». Насамрэч у большасці (!) сельскагаспадарча-вытворчых кааператываў, як высветлілася, з колькасцю работнікаў істотных праблем няма. Праблема ў іншым — у іх якасці.

«З «зялёным змеем» змагаемся да апошняга»

— На днях разлічыў работніцу, якая разам з сям'ёй прыехала да нас са Стаўбцоўскага раёна, — расказвае **старшыня СВК «Крутагор'е-Петкавічы», што ў навакол-лі Дзяржынска, Леанід ЧЫЖЫК.** — Яна — маці дваіх дзяцей, аднаму з якіх толькі 5 гадоў — трапіла ў трывалыя путы алкаголю. Што мы толькі ні рабілі: і прасілі, і накіроўвалі на прымусовае лячэнне. А яна як піла, так і п'е. Шкада яе дзетак. Яны ж ні ў чым не вінаватыя.

П'янства, і тут я не адкрываю Амерыку, — страшная навала для вёскі. Раней злоўжывалі выключна мужчыны, а цяпер, што самае страшнае, співацца пачалі маці і маладыя людзі.

— Вось сёлета да нас на працу прыйшлі з вучылішча сем маладых спецыялістаў, — кажа Леанід Чыжык. — Два з іх паступілі ў ВНУ, аднаго ж лайдака, які заявіў, што не хоча працаваць механізатарам у «калгасе», давялося звольніць за п'янку.

— Вы можаце сабе дазволіць такую раскошу, як раскідвацца кадрамі? — цікаўлюся. — Тым больш падчас крызісу...

— Па Дэкрэце такіх злосных парушальнікаў трэба адразу звальняць. Мы ж, спытайце ў любога, спрабуем вырваць работніка з лапаў «зялёнага змея», за кожнага змагаемся да апошняга. І ведаеце, я не сказаў бы, што сёння ў сельскагаспадарчай галіне ёсць вострая праблема з колькасцю кадраў. Людзей ў вёсцы стала менш, але з увядзеннем сучаснай тэхнікі столькі, колькі было раней, і не патрэбна.

«Я не сказаў бы, што ў нас праблема з колькасцю кадраў»

І сярод гараджан ёсць тыя, каго вабіць зямля. Шмат жыхароў Дзяржынска прамянялі на яе асфальт. Яны штодзень, хто на ўласным аўтамабілі, а хто на «калгасным» аўтобусе, прыязджаюць на працу ў СВК «Крутагор'е-Петкавічы». Едуць уладкоўвацца на працу і людзі з іншых абласцей. З жыллём праблем, дзякуй Богу, няма, штогод будуецца па 5-10 дамоў ці кватэр.

— Нядаўна на нашу абвестку ў інтэрнэце адгукнулася маладая пара з Браслаўскага раёна, — распавядае кіраўнік гаспадаркі. — Ёй 29 гадоў, яму — 21. Як толькі я іх убачыў, адразу зразумеў, што браць іх ні ў якім разе нельга. Калі затрымаюцца, то ненадоўга. Маю інтуіцыю пацвердзіла і працоўная кніжка хлопца: у такім маладым узросце ён паспеў памяняць ажно тры месцы працы.

«Кожнаму важна адчуваць сваю значнасць»

На зваротным баку вокладкі запісной кніжкі старшыні СВК «Крутагор'е-Петкавічы» напісаны «залатыя» словы: «Людзі былі і застаюцца галоўным багаццем. І я ўдзячны Богу за тое, што ён даў мне магчымасць імі кіраваць». Кіраваць — гэта мастацтва. Да работнікаў, не важна, галоўны гэта спецыяліст ці даярка, кіраўнік павінен ставіцца па-чалавечы. Старацца хваліць часцей, каб яны адчувалі сваю важнасць.

— Мы штогод праводзім конкурс на лепшага па прафесіі, пераможцы якога атрымліваюць прэмію — 10 базавых велічыняў. Акрамя таго, кожны сумленны работнік можа разлічваць на прыбаўку да адпускных — 10 працэнтаў ад асноўнага заробку. Парушальнікі ж пра прэмію могуць забыцца.

Майстар ад Бога

У сельскай гаспадарцы без каманднага духу далёка не паедзеш. Важна гэта асабліва ў сезон, калі ледзь паспееш збожжа ўбраць з поля, як трэба браць за бульбу, кукурузу, буракі... Прычым правілы гульні тут дыктуе надвор'е. Паспеш сёння ўбраць — будзеш з хлебам, не — застанецца толькі локці кусаць.

— Вось і цяпер тых, хто мае пасведчанне кіроўцы, падключаем да ўборкі кукурузы, работнікаў жа бухгалтэрыі — да ўборкі яблыкаў у садзе. Калі трэба, людзі працуюць і да васьмі, і да дзевяці, і нават да дзесяці гадзін вечара. Я ж, у сваю чаргу, таксама стараюся ісці ім насустрач. У каго ёсць на тое патрэбна, даю выхадны сярод тыдня.

У СВК «Крутагор'е-Петкавічы», як і паўсюль, ёсць розныя работнікі.

— Але большасць, на шчасце, добрыя, — кажа Леанід Чыжык.

— Вось, напрыклад, **майстар-наладчык Уладзімір КОПАЦЬ на пару з Леанідам БАТУРАМ** сабралі з ваеннай тэхнікі і са спісаных агрэгатаў для гаспадаркі чатыры машыны, — расказвае **намеснік старшыні па механізацыі Юрый КЛІМАШ.** — Яны — майстры ад Бога. Уладзімір Копаць, акрамя таго, і на працу ездзіць на самаробным міні-трактары, аздобіў уласную сядзібу зробленымі сваімі рукамі варотамі з дыстанцыйным кіраваннем, лазняй, дзе ўсё працуе ў аўтаматычным рэжыме.

Мясцовага «самаробкіна» мы знайшлі на кукурузным полі. Праўда, «зорная» хвароба яго не закранула. Сціплы і нешматслоўны, Уладзімір Копаць не любіць сябе расхвальваць.

— У мяне няма вучонай ступені. За ўсё, што я ўмею, удзячны адна-вяскоўцу, які заразіў мяне сваім апантаным стаўленнем да тэхнікі. Я цяпер таксама з радасцю перадаў бы свой вопыт і веды каму-небудзь. Але мясцовая моладзь не цікавіцца гэтым, на жаль. Ды і наогул у маладых людзей сёння няма той адданасці сваёй працы, якая характэрная была для майго пакалення.

Маладым — дарогу

Што гэта за салдат, які не марыць стаць генералам? — любіць паўтараць мой знаёмы. Калі доўга таптацца на адным і тым жа месцы, нядоўга страціць цікавасць не толькі да працы, але і да жыцця. Таму, пераканана, работнік павінен бачыць перспектыву росту.

Андрэй ЯКАЎЛЕЎ прыехаў у СВК «Крутагор'е-Петкавічы» чатыры гады таму пасля заканчэння эканамічнага ўніверсітэта. Яго замацавалі за галоўным эканамістам з саракагадовым стажам.

— Праца падабалася, але заробак не зусім задавальняў. Я, як і большасць учарашніх студэнтаў, хацеў усё і адразу. Ды і сябры падбухторвалі: «Кідай ты гэту працу і перайзджай у горад». Шчыра прызнацца, жыла ў галаве думка адпрацаваць два гады па размеркаванні і звольніцца. Але старшыня памяняў усе мае планы адным махам. Запрасіў у кабінет і прапанаваў заняць пасаду галоўнага эканаміста. Каляжанцы ж, так як яна дасягнула пенсійнага ўзросту, у якасці альтэрнатывы даў магчымасць узначаліць прафсаюзную арганізацыю. Я, не доўга думаючы, згадзіўся і ніколькі аб гэтым не шкадую. Праўда, прапарцыянальна росту заробку ўзрасла і нагрузка. Удзячны сваёй папярэдніцы, якая і цяпер, калі трэба, робіць мне падказкі.

* * *

Ад каго ці ад чаго залежыць якасць работніка? Як можна захвоціць чалавека працаваць на зямлі і пры гэтым развівацца? Адказ на пытанні шукаем разам з рэктарам Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў АПК БДАТУ Уладзімірам ДАШКОВЫМ.

«Добры работнік з неба ніколі ці звалiцца»

— Развіццё работніка ў многім вызначаецца ўзроўнем кіраўніка, — пераканаць Уладзімір Дашкоў. — На жаль, большасць з іх забываюцца, як самі, прыйшоўшы на першае месца працы, не ведалі, з якога боку дзверы адчыніць, і пачынаюць «здзіраць з маладога і неспрактыкаванага па тры шкуры». Але перш чым патрабаваць, трэба не адзін месяц паважыцца з новым работнікам. Не ўсе кіраўнікі да гэтага гатовыя. «Не бяда, калі захоча звольніцца, разважаюць некаторыя, усё адно новага прышлюць». Нядзіўна, што хлопцы і дзяўчаты, адпрацаваўшы 2 гады і не знайшоўшы падтрымкі, нярэдка збягаюць з месца размеркавання. І куды б вы думалі? У іншую гаспадарку, дзе ў іх будуць зацікаўленыя, але ўжо нефармальна. Для таго, каб хоць нейкім чынам змяніць сітуацыю, **мы прапаноўваем аднавіць інстытут настаўніцтва. Добра было б, каб пры ацэнцы працы кіраўніка ўлічвалася і тое, колькі ён падрыхтаваў якасных спецыялістаў.**

У «гарачую» для СВК восеньскую пару і работнікі бухгалтэрыі падключаюцца да ўборкі ўраджаю.

Уладзімір Дашкоў таксама адзначыў, што сёлета ў БДАТУ павялічаны набор «мэтавікаў». Гэта станоўчая тэндэнцыя, бо кіраўнікі гаспадарак змогуць мэтанакіравана фарміраваць будучую каманду.

«Нельга эканоміць на чалавеку»

— Мне вельмі падабаецца жыццёвая пазіцыя генеральнага дырэктара ААТ «Белавежскі» Камянецкага раёна Юрыя Мароза, які працуе па прынцыпе, што нельга эканоміць на чалавеку. Укараненне новых тэхналогій і тэхнікі патрабуе высокакваліфікаваных спецыялістаў. Апошнія, у сваю чаргу, таксама маюць патрэбу ў лепшых умовах жыцця для сябе і сваёй сям'і. Юрый Мароз разумеў, што для таго, каб замацаваць чалавека на зямлі, трэба павысіць узровень яго жыцця. У яго нават ля фермы кветкі квітнеюць. Самі ж бачыце, што ў добрых гаспадарках і чалавек добра жыве. А калі працуе даярка ў брудзе і атрымлівае ў канцы месяца 200 тысяч, то і дома нічога не будзе ладзіцца. У сваю ж гаспадарку трэба таксама ўкладаць грошы, а дзе яна іх возьме?..

Павінен быць стымул

— У Міністэрстве аховы здароўя функцыянуе сістэма атэстацыі работнікаў галіны. У прынцыпе такая сістэма ёсць і ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання. Але яна пакуль што слаба працуе. Урачы спачатку праходзяць курс павышэння кваліфікацыі, а толькі пасля здаюць іспыт незалежнай камісіі, заснаванай Міністэрствам аховы здароўя. У нас жа атэстацыя праводзіцца ў самой гаспадарцы ці, у лепшым выпадку, на раённым узроўні. І не сакрэт, што калі ў работніка не вельмі добрыя стасункі з начальствам, на катэгорыю ён наўрад ці зможа разлічваць. Я думаю, што нядрэнна было б надаць атэстацыі і работнікаў сельскай гаспадаркі больш сістэмны характар. Гэта дало б стымул працаваць над сабой, бо сёння цікавасць да павышэння кваліфікацыі не перавышае 50 працэнтаў. Палова з тых, хто да нас прыязджае, не зацікаўленыя павышаць узровень свайго майстэрства. Проста няма канчатковага інтарэсу. Чаму сярод урачоў конкурс — хто сёлета паедзе на курсы павышэння кваліфікацыі? Бо ведаюць, што, адвучыўшыся, можна здаць кваліфікацыйны экзамен і ўзняцца на наступную прыступку. А да спецыяліста вышэйшай катэгорыі, несумненна, і стаўленне іншае. Ды і прыбаўка да зарплаты ніколі не пашкодзіць.

Надзея ДРЫЛА. Фота аўтара.

Свой трактар Уладзімір КОПАЦЬ збіраў на працягу трох месяцаў і цяпер ездзіць на ім на працу.

ПАНЯДЗЕЛАК, 12 КАСТРЫЧНІКА

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.05, 7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 1.10 Зона Х.
7.30, 8.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.30 У свеце матораў.
9.10 Nota Bene.
9.35 «Здароўе».
10.00 «Жыццё як жыццё». Жаночае ток-шоу.
11.00, 17.50 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
12.10 Камедыя «Суженый-ряженый».
14.05 Культурныя людзі.
14.30 Дак. цыкл «Нябачны фронт».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 «Шпіён па ўласным жаданні».
15.55 Серыял «Тэрмінова ў нумар».
16.45 Серыял «Сёстры па крыві».
19.30 «Арэна».
19.55 Ток-шоу «Ход у адказ».
21.00 Панарама.
21.50 Спецыяльны рэпартаж «Модныя кадры».
22.05 Серыял «Часткі цела».
23.30 Баявік «Наёмнікі».
1.15 Дзень спорту.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00, 1.25 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10 «Дыханне планеты».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.15, 1.40 Навіны спорту.
11.10 «Кантрольная закупка».
11.40 «Ералаш».
12.00 «Малахаў+».
13.10 «Зразумець. Дараваць».
13.40 «Модны прыгавор».
14.40 «Дэтэктывы».
15.15 Серыял «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант».
16.15 Ералаш.
16.40 «Бітва тытанаў».
18.20 Серыял «Мая цудоўная нянька».
18.55 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.05 Ток-шоу «Выбар».
22.00 Серыял «Браты-дэтэктывы».
23.20 «Злачынствы стагодзя.
23.55 «Прафесійны бокс. Джонатан Бэнкс — Хаўер Мора».
0.35 «У захапленні ад цябе». Серыял.

7.00 ЛАДная раніца.
8.00, 23.20 Серыял «Юрыкі».
8.30 У гэты дзень.
8.35, 17.00 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
9.35, 18.00 Серыял «Каханне як каханне».
10.30 Меладрама «Павадыр».
12.10 «Пра мастацтва».
12.35 Школа рамонту.
13.25 Серыял «Монк».
14.55 Мультсерыял «Русалачка».
15.15 «Хачу ўсё ведаць». Кіначасопіс для дзяцей.
15.25 Пазакласная гадзіна.
15.40 Тэлебарометр.
16.00, 23.50 Серыял «Камісар Мегрэ». 1-я серыя.
19.05 Хакей. КХЛ. Аўтамабіліст (Екацярынбург) — Дынама (Мінск).
21.20 Вялікае сэрца.
21.55 Беларуская часінка.
22.50 Хакей. Формула гульні.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30,19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.35 «Вялікае снеданне».
10.05 «Пяць гісторый».
10.40 Серыял «Анёл-ахоўнік».
11.45, 17.30 «Званая вячэра».
12.40, 18.30 Серыял «Былая».
13.50 «Зорны рынг».
15.05 «Далёкія сваякі».
15.30 «Гарачы лёд».
16.00 «Культурнае жыццё».
16.50 «Я — падарожнік».
17.10 «Наша справа».
20.00, 22.55 «Сталічныя падрабязнасці».
20.20 «Добры вечар, малы».
20.35 Маст. фільм «Таямнічы вострау».
23.00 «Сталічны футбол».
23.30 «Гучная справа».

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05 «Разам».
6.05 «Цік-так».
6.20 Мультфільм «Кржэмілек і Вахмурка ігралі для маленькай феі».
6.30, 7.45, 9.35, 10.50 «Удачная пакупка».
6.40 Серыял «Новыя прыгоды Скіпі».
7.55 «Білет на сёння».
8.05 «Лёгкае жыццё».
8.30 Серыял «Скрыжаванне».
9.45 «Садружнасць. LIVE».
10.05 Серыял «Вядзьмарскае каханне».
11.05, 23.05 Маст. фільм «Пасажыр, які заснуў».
12.30 «Смачны свет. Асецінская кухня».
13.05 Мультсерыял «Прыгоды маленькай рыбкі».
13.30 Серыял «Старшакласнікі».
14.05 Серыял «Дзядуля маёй мары».
14.30 «Забароненыя тэмы гісторыі: Загадкі старажытнага Егіпта».
15.20 «Дыялог з усім светам».
16.05, 3.50 Серыял «Ад'ютанты кахання».
17.05 Серыял «Зімняя вішня».
18.20 «Акцэнты».
18.30 Ток-шоу «Слова за слова».
19.30 Серыял «Мёртвы, жывы і небяспечны».
20.30 «Агульны інтарэс».
21.20 «Свет спорту».
22.05 «Хіт-экспрэс».
1.05 Дак. фільм «Кома — гэта праўда».
1.45 Маст. фільм «Марадона».

7.00, 10.50 Навіны кіно.
7.10 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
7.25, 21.00, 23.40 Астра-, метэапрагноз.
7.30 Маст. фільм «Анжаліка і кароль».
9.10 «Клуб-700».
9.30 «К-відэа» для дзяцей.
9.50 Серыял «Хросны бацька».
11.00 Камедыя «Дэжа вю».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 «Мультпарад».
16.50 «Ін-фармацыя».
17.00 Серыял «Свавольнікі».
17.30 Серыял «Яна напісала забойства».
19.15 «Мой любімы гадаванец».
19.45 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».
20.45 «Вечарніца».
20.55 «К-відэа» для ўсёй сям'і.
21.05 Маст. фільм «Знахар».

6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Сёння.
6.05 «Сёння раніцай».
8.40 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
9.10 «Крамлёўская кухня».
10.20 «Сярэдні клас».
11.10 «Кулінарны паядынак».
12.10 «Следства вялі...».
13.30 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
15.35, 18.25, 22.40 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.30 Серыял «Ліцейны».
19.35 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў-9».
21.35 Серыял «Час Волкава».
23.25 «Сумленны панядзелак».
0.15 «Школа зласлоўя».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.20, 19.30 Серыял «Аднойчы будзе каханне».
10.10 «Гарэм». Дак. фільм.
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.25 «Ранішняя пошта».
11.55 Камедыя «Толькі ў мюзік-холе».
13.05 «Захавальнікі Меліхава». Дак. фільм.
13.35, 17.20 «Гарадок».
13.50, 16.50, 18.50, 23.45 Навіны—Беларусь.
14.20, 22.30 Серыял «Вядзьмарскае каханне».
15.10 Маст. фільм «Рэцэпт вядзьмаркі».
17.50 Серыял «Кармеліта. Цыганская страсць».
20.30 Серыял «Пелагія і белы бульдог».
23.30 «Нічога асабістага».
23.55 «Весткі+».
0.15 «Мой сярэбраны шар. Лайза Мінэлі».

6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Сёння.
6.05 «Сёння раніцай».
8.40 «Чыстасардэчнае прызнанне».
9.10 «Сеанс з Кашпіроўскім. Знакі лёсу»:
10.20 «Сярэдні клас».
11.10 «Кватэрнае пытанне».
12.10, 19.40 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў-9».
13.30 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
15.30, 18.25 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.25 Серыял «Ліцейны».
21.50 Серыял «Час Волкава».
23.25 «Вочная стаўка».
0.15 «Ракавы дзень. Шахта «Цэнтральная».

5.00, 15.40 Клінічны гіпноз.
5.30, 16.10 Партрэт доктара.
6.00, 16.40 Я чакаю дзіця.
6.30, 17.10 Курс лячэння.
7.00 Цяга да жыцця.
7.40, 11.30, 18.20, 0.05 Набалелае пытанне.
8.20, 21.05 Будзем здаровыя!
8.50, 21.35 Школа розуму.
9.20, 10.50, 23.35 Правілы здароўя.
9.50, 22.35 Дзіця нарадзілася.
10.20, 23.05 Як не страціць здароўе.
12.10, 0.45 Колькі вам гадоў?
12.40, 22.05 Панацэя.
13.10, 2.00 Увага, ежа!
13.35, 2.25 Выкрыццё прадуктаў.
14.05, 19.00, 2.55 Здароўе.
14.40, 19.35, 3.30 Пазнай сябе.
15.10, 20.05, 4.00 Нетрадыцыйная медыцына.
17.40 Здароўе ад зоркі.
20.35 Спытайце доктара.
1.15 Энцыклапедыя памылак.
1.30, 4.30 Хуткая дапамога.

6.00, 10.50, 11.50, 12.50, 15.50, 16.50, 17.50, 18.50, 22.55 Парады ТДК.
6.35, 14.00 Усё лепшае, для Вас.
7.35, 10.00, 17.00, 1.00 Красуня.
8.00 Добрай раніцы, Каханая!
9.00 Ранішні фрэш.
11.00, 2.00 Нашы дзеці.
12.00, 18.00, 22.10, 5.00 Ваш доктар.
13.00, 22.00 Прыгажосць і здароўе.
13.30, 22.30 Серыял «Гвадэлупе».
15.00, 4.00 Твой дом.
16.00, 3.00 Гісторыі поспеху.
19.00 Люстэрка жыцця.
20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
21.00 Сэксуальная рэвалюцыя.
23.05 «Знакі лёсу».

7.00, 11.50, 16.25 «SOS дзікай прыроды».
7.25, 12.15, 15.30 «Ветэрынарная «хуткая дапамога».
7.50 Дзённікі паляўнічага на кракадзілаў.
8.45, 12.45 «Самыя забаўныя жывёлы планеты».
9.40, 16.50 Ветэрынары-стажоры.
10.05, 17.20, 20.10, 22.55, 3.30 Паліцыя Фенікса — Аддзел па абароне жывёл.
10.55 Паляўнічы на кракадзілаў.
13.40 Выратаванне відаў.
14.35, 5.20 Маёнтак сурыкатаў.
15.00, 5.45 «Малпіна жыццё».
15.30 «Пашпарт для любімца».
18.15, 22.00, 2.35 Сабакі-паліцэйскія.
21.05, 1.40 Дзікія і небяспечныя.

9.30 Снукер.
11.45, 14.30, 19.30, 0.15 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету.
12.45 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. Сербія — Румынія.
13.30, 20.10 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. Расія — Германія.
15.30, 21.00, 1.15 Футбол. Чэмпіянат свету (U-20).
20.00 Футбол. Еўрагалы.
23.15 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. Партугалія — Венгрыя.
0.00 Экстрэмальныя віды спорту.

9.00 Ранішні фрэш.
11.00, 2.00 Нашы дзеці.
12.00, 18.00, 22.10, 5.00 Ваш доктар.
13.00, 22.00 Прыгажосць і здароўе.
13.30, 22.30 Серыял «Гвадэлупе».
15.00, 4.00 Твой дом.
16.00, 3.00 Гісторыі поспеху.
19.00 Люстэрка жыцця.
20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
